Стар. 3, 4

СПЕЦВЫПУСК «ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!»:

БЕЛАРУСКІЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ЗАПРАШАЮЦЬ

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 МАЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 92 (26450)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Ідзе падпіска на II паўгоддзе 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	**10600**	**31800**	**63600**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**9990**	**29970**	**59940**
63858 (ведамасны)	**17050**	**51150**	**102300**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**15550**	**46650**	**93300**
Да запатрабавання (праз газетныя кіёскі РУП «Белпошта»)			
63850 (індывідуальны)	**9460**	**28380**	**56760**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8850**	**26550**	**53100**
63858 (ведамасны)	**14926**	**44778**	**89556**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**13639**	**40917**	**81834**
Да запатрабавання (праз кіёскі «Белсаюздруку»)			
63850 (індывідуальны)	**8410**	**25230**	**50460**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**7830**	**23490**	**46980**
63858 (ведамасны)	**11086**	**33258**	**66516**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**10525**	**31575**	**63150**

Тэндэнцыі стабілізацыі эканомікі назіраюцца ў Беларусі

Аб прагнозах работы шэрагу галін эканомікі краіны за 5 месяцаў 2009 года Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажыў 21 мая першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка.

Паказчык ВУП чакаецца на ўзроўні 101,2 працэнта, як і па выніках чатырох месяцаў 2009 года. Тэмп росту прамысловай вытворчасці крыху ўзрос адносна студзеня—красавіка і складзе 96,5 працэнта. Урад таксама распрацаваў нарматыўны дакумент, накіраваны на стымуляванне экспарту і цывілізаваную абарону свайго рынку.

Кіраўніку дзяржавы даложана аб выніках удзелу беларускай дэлегацыі ва ўстаноўчым саміце ініцыятывы «Усходняга партнёрства» Еўрапейскага саюза, што праходзіў 7 мая ў Празе.

Беларусь прыняла актыўны ўдзел у распрацоўцы падагульняючага дакумента саміту — Дэкларацыі, унёсшы ў яе найбольш канкрэтныя, прадметныя прапановы. Па ініцыятыве беларускага боку з тэксту Дэкларацыі былі зняты ўсе палітычныя нюансы, што выключае падставу трактаваць ініцыятыву як спробу «сябраваць супраць некага». Акрамя таго, «Усходняе партнёрства» прызнана адкрытым для ўдзелу ў ім іншых краін. Работа Беларусі па падрыхтоўцы падагульняючага дакумента атрымала высокую ацэнку замежных партнёраў.

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, абмеркаванне ў час саміту праходзіла спакойна, у вытрыманых тонах, і не было палітызаваным. Удзельнікі саміту пацвердзілі, што гэта еўрапейская ініцыятыва накіравана, перш за ўсё, на вырашэнне пытанняў у сферы інфраструктуры, агульнай энергабяспекі, свабоднага перамяшчэння людзей, аблягчэння візавага рэжыму.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўдзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» ні ў якім выпадку не будзе перашкаджаць супрацоўніцтву ў рамках іншых утварэнняў, і ў прыватнасці, Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі. Адна з асноўных мэтаў, якую мае Беларусь, прымаючы ўдзел у гэтай еўрапейскай праграме — нармалізацыя гандлёвага рэжыму з Еўрасаюзам, аж да ўвядзення зоны свабоднага гандлю. На краіны ЕС прыпадае больш за палову аб'ёму знешняга гандлю Беларусі: $14,5 млрд з амаль $23 млрд тавараабароту ў 2008 годзе. Пры гэтым сальда для Беларусі склалася дадатнае. Для параўнання, у Расію было экспартавана тавараў на суму каля $10 млрд.

Беларусь, прымаючы рашэнне аб удзеле ў ініцыятыве «Усходняе партнёрства», мела прагматычныя мэты. Наша краіна зацікаўлена ў прыцягненні ў эканоміку інвестыцый, інфраструктурных праектаў.

У час сустрэчы ўвага таксама была ўдзелена рабоце Шклоўскага завода газетнай паперы. Кіраўніку дзяржавы даложана, што на прадпрыемстве ідзе няпросты працэс даводкі абсталявання, запушчанага ў маі мінулага года. Аб'ёмы вытворчасці газетнай паперы паступова павялічваюцца. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што да канца 2009 года завод павінен выйсці на праектную магутнасць.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Без выкаранення карупцыі ў дзяржорганах нельга навесці парадак у краіне

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы са старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Вадзімам Зайцавым.

Назначаючы на пасаду ў мінулым годзе новага старшыню КДБ, кіраўнік дзяржавы даў шэраг даручэнняў, якія датычацца паляпшэння якасці работы ведамства і павышэння яго ролі. Прэзідэнт заслухаў даклад аб тым, што было зроблена за гэты перыяд у КДБ.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што «органы дзяржбяспекі павінны працаваць значна лепш, а роля і значэнне КДБ павінны быць узняты на тую вышыню, на якой яны былі ў лепшыя савецкія часы».

У сувязі з тым, што Камітэт дзяржаўнай бяспекі праводзіць актыўную работу па выкараненні карупцыі ў дзяржорганах, Прэзідэнта цікавіла сітуацыя ў гэтай сферы. «Без навядзення ў дзяржорганах парадку, мы не навядзём парадак у краіне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт Беларусі звярнуў на неабходнасць дакладна выконваць яго патрабаванне па забеспячэнні чысціні чэкісцкіх радоў. У органах дзяржбяспекі не павінна быць месца негатыўным фактам.

Асобна была ўзнята тэма перыядычна прымаемых звонку спробаў кампраметацыі і сутыкнення сілавых структур, у прыватнасці КДБ і МУС. Апошнім часам было некалькі інфармацыйных укідаў у Інтэрнэт, якія былі накіраваны менавіта на дасягненне гэтых мэтаў. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў, што «рэакцыя павінна быць адна: вы на дзяржаўнай службе і трэба дзейнічаць у інтарэсах народа».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КОЛЬКІ ПРАЕХАЎ, ЗА СТОЛЬКІ ЗАПЛАЦІЎ

З 1 чэрвеня Беларуская чыгунка пераходзіць на пакіламетровы тарыф у прыгарадных зносінах. Цяпер пасажыр будзе плаціць за праезд толькі за фактычную адлегласць, што праехаў на электрычцы. Паведамлялася, што гэта новаўвядзенне абавязана сваім з'яўленнем просьбам насельніцтва.

Сяргей РАСОЛЬКА.



МІКОЛА ВЕСНАВЫ

Адразу ў трох мінскіх храмах сустрэнуць 22 мая пластольнае свята

Усе яны прысвечаныя Мікалаю Цудатворцу, паведамілі ў Мінскім епархіяльным управленні.

Веснавы Мікола — так нярэдка называюць дзень памяці Мікалая Цудатворцы, які адзначаецца 22 мая, у адрозненне ад Міколы зімовага, які прыпадае на 19 снежня. Гэтага святога шануюць і праваслаўныя, і каталікі. У Беларусі сёння дзейнічаюць больш як 150 Мікольскіх праваслаўных храмаў. У Мінску іх тры.

Часцінку мошчаў Цудатворцы ў 2006 годзе прывезлі нашы землякі на чале з Мітрапалітам Філарэтам з паездкі ў швейцарскі Фрыбург, дзе захоўваецца рука святіцеля Мікалая. Цяпер гэты дар знаходзіцца ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы. Кожны год 22 мая святыню выносяць для пакланення мінчан і гасцей горада.

Таццяна БАЦЮК, «Мінск—Навіны».

*Жыхарка вёскі Ладараж Пінскага раёна **Надзея Міхайлаўна КУРАДАВЕЦ** верыць, што Святы Мікола — апякун яе сям'і і дабрабыту. Двойчы на год яна, цудоўная майстрыха, вышывае іконы свайго святога. Вясною, 22 мая, і ўвосень.*

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

На выхадныя шквалісты вецер і моцныя ліўні

паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Мінприроды Дзмітрый РАБАЎ.

У суботу, нядзелю і панядзелак амаль паўсюдна па краіне будзе даволі воблачна і пройдуць сур'ёзныя дажджы. У суботу па паўднёвым захадзе краіны чакаюцца моцныя ліўні, удзень у асобных раёнах навальніцы, падчас якіх будзе назірацца шквалістае ўзмацненне ветру хуткасцю да 15—20 м/с. Тэмпература ў суботу ўначы 7—14, удзень 10—17, па поўдні краіны — да 19 градусаў.

У нядзелю ўдзень чакаецца ўзмацненне ветру па паўночным усходзе да 15—18 м/с. Уначы 4—10, удзень — 14—19, па паўднёвым захадзе да 22 цяпла. У панядзелак таксама будзе вільготна, уначы 6—12, удзень 14—20 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Арэнда жылля

ПРАПАНОВА ЗАШКАЛЬВАЕ

Аднапакаёўкі — 180 USD і танней

Менавіта ў апошні месяц вясны на рынку сталічнай арэнды жылля назіраецца сапраўдная хваля масавай прапановы сезонных і новых кватэр. У сталіцы хапае пенсіянераў, якія маюць і невялікае, і шматпакаёвае жыллё, але ўвесь летні сезон жывуць на дачах. Сёння такія кватэры ўжо не пустуюць па 4—5 месяцаў, а прапаноўваюцца кватарантам. З іншага боку, у сувязі з істотна патаннелым квадратным метрам пэўная частка ўласнікаў «лішніх» кватэр здымае сваё жыллё з продажу і накіроўвае ў сферу арэнды.

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела арэнды жылля сталічнага агенцтва «Час пік» Сяргея КАДОЛЫ,** цяпер у агенцтвах кватэр, як тых фанцікаў, — на самы розны колер і густ. І так аб'ёмістая база звестак толькі аднаго агенцтва штодзённа папаўняецца на 50—60 новых варыянтаў, дзе доля аднапакаёвых кватэр складае каля 20 паступленняў. Сярэдні кошт арэнды даволі якасных аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах складае каля 200 долараў. Разам з тым нават у гэтых месцах кватэры са старой мэбляй ці без яе або ў выпадку, калі гаспадару трэба здаць жыллё на працягу 2—3 дзён, прапаноўваюцца ўжо за 180 долараў. Можна адшукаць і таннейшыя кватэры. Не вельмі прыгожыя кватэры ў старых дамах Чыжоўкі або маленькія па плошчы памяшканні ў дамах маласямейнага тыпу ў Шабанах часам прапаноўваюцца і за 170 долараў.

Сяргей Кадол адзначае, што цяпер на рынку пачынае працаваць і механізм па актыўным пошуку танных кватэр. Спрактыкаваныя кватаранты заказваюць у агенцтвах таннае жыллё, бо, у сваю чаргу, згодныя плаціць адразу за некалькі месяцаў. Арэнда аднапакаёвых кватэр, дзе прадугледжана перадаплата за 4—6 месяцаў, можа дасягаць мінімальнай мяжы ў 150 долараў.

Існуюць на рынку стандартныя аднапакаёвыя кватэры, якія карыстаюцца стабільным попытам у кліентаў з сярэднім заробкам. Аднапакаёўкі ўздоўж першай лініі метро і па другой лініі да станцыі «Маладзёжная» каштуюць да 250 долараў. Вялікім попытам карыстаюцца нават невялікія аднапакаёвыя кватэры побач з Камароўкай, кошт арэнды якіх дасягае і зараз 270 долараў. Даволі якасныя аднапакаёвыя кватэры, звычайна з еўрарамонтам, у цэнтры Мінска каштуюць цяпер да 300 долараў.

З'явіліся двухпакаёўкі за 220 USD

Сёлета ў маі літаральна ва ўсіх спальных раёнах сярэдні кошт арэнды стандартных двухпакаёвых кватэр складае 250 долараў. Аднак і ў гэтым сегменце арэнды існуюць мінімальныя цэннікі, калі не вельмі якасныя двухпакаёўкі ў старых дамах Серабранкі, Чыжоўкі і ў Шабанах пачалі здавацца і за 220—230 долараў. Побач з Нямігай і каля ЦУМа нават звычайныя двухпакаёвыя кватэры прапаноўваюцца кватарантам ад 270 долараў плюс квартплата.

Як і прагназавалася экспертамі яшчэ некалькі месяцаў таму, у другой дэкадзе мая на рынку арэнды з'явіліся танныя шматпакаёўкі. У далёкіх мікрараёнах сталіцы і ў новабудоўлях з'явілася дастатковая колькасць трохпакаёвых кватэр за 250 долараў. Выключэнне складае толькі добра абжыты раён Сухарава, дзе трохпакаёвыя кватэры каштуюць 270 долараў плюс квартплата. Увогуле, максімальны кошт арэнды звычайных трохпакаёвых кватэр ва ўсіх спальных раёнах Мінска складае цяпер 300 долараў плюс квартплата.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 24 июня 2009 года

Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 40 по ул. Янковского в г. Минске

№ лота	Наименование объекта				Площадь, кв.м		Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
	№ квартиры	количество комнат	этаж	подъезд	общая	жилая		
1	4	2	1	1	57,5	31,0	149 500 000	14 950 000
2	8	2	2	1	57,6	31,0	149 760 000	14 976 000
3	11	1	2	1	43,0	17,9	111 800 000	11 180 000
4	16	1	3	1	43,1	18,0	112 060 000	11 206 000
5	20	2	4	1	57,7	31,0	150 020 000	15 002 000
6	27	2	5	1	57,5	31,0	149 500 000	14 950 000
7	28	1	5	1	43,0	17,9	111 800 000	11 180 000
8	34	2	6	1	57,6	31,0	149 760 000	14 976 000
9	42	1	7	1	43,0	18,0	111 800 000	11 180 000
10	43	2	7	1	57,9	31,1	150 540 000	15 054 000
11	48	2	8	1	57,7	31,1	150 020 000	15 002 000
12	52	2	8	1	57,9	31,2	150 540 000	15 054 000
13	58	1	9	1	42,8	18,0	111 280 000	11 128 000
14	61	3	9	1	75,1	45,2	195 260 000	19 526 000
15	64	2	10	1	57,5	31,2	149 500 000	14 950 000
16	67	1	10	1	42,8	17,9	111 280 000	11 128 000
17	73	2	11	1	57,5	31,1	149 500 000	14 950 000
18	82	3	12	1	74,6	45,0	193 960 000	19 396 000
19	88	1	13	1	42,9	18,0	111 540 000	11 154 000
20	103	3	15	1	74,7	45,0	194 220 000	19 422 000
21	104	2	16	1	57,5	31,0	149 500 000	14 950 000
22	121	1	18	1	42,8	18,0	111 280 000	11 128 000
23	127	2	19	1	57,5	31,0	149 500 000	14 950 000

1) Аукцион состоится **24 июня 2009 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд. 310), регистрация участников – в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица – граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы (57 430 руб.).

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе по письменному заявлению участника аукциона на лицевой его счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка).

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально. Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 15 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 15 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с **27 мая 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 23 июня 2009 г. до 17.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). Телефон для справок: 227-40-22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 27 мая 2009 г. по понедельникам и средам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск ул. Янковского, 40. Телефоны для справок: 207-19-15; 208-58-12. Интернет: www.mapid.by.

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 28 мая 2009 года 86-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 16.05.09)

ИСКЛЮЧИТЬ ЛОТ № 65.

УНП 190398583

БПС-БАНК

С 22.05.2009 по вновь привлекаемым депозитам в иностранной валюте (доллары США, евро, российские рубли) устанавливается следующий размер процентов:

Наименование	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
		в долларах США, Евро	в российских рублях
«Оптимальный»	6 месяцев	9	9
«Динамичный»	1 год 3 года	8,75 9	8,75 10
Карт-счет «Универсальный»	1 год	8,75	—

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

Сохранность и возврат вкладов физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк» или по телефону – **148** (бесплатный в стационарной сети).

Проценты, выплаченные по вкладам в иностранной валюте в течение 2008 г. (млрд. руб.): январь – 2,5; февраль – 2,5; март – 2,9; апрель – 2,9; май – 2,5; июнь – 3,1; июль – 3,2; август – 3,0; сентябрь – 3,4; октябрь – 3,1; ноябрь – 2,3; декабрь – 4,1.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 22.05.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 760,00
▲ 1 еўра	3 803,00
1 латвійскі лат	5 366,00
1 літоўскі літ	1 101,18
1 чэшская крона	142,69
1 польскі злоты	868,70
▲ 1 расійскі рубель	87,73
1 украінская грыўня	362,44

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,4586
10 UAH	41,3114
1000 BYR	11,3528
EUR	43,3562

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

aquabel

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже объектов недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта недвижимости	Общая площадь по СНБ, кв.м	Начальная цена с НДС, у.е.	Адрес объекта
1.	Квартира 2-х комн.	104,2	135 460	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 25, этаж № 5
2.	Квартира 3-х комн.	129,2	167 960	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 41, этаж № 9
3.	Квартира 2-х комн.	101,3	131 690	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 34, этаж № 7
4.	Квартира 2-х комн.	101,1	131 430	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 14, этаж № 3
5.	Квартира 2-х комн.	107,2	139 360	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 45, этаж № 9
6.	Квартира 2-х комн.	101,4	131 820	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 44, этаж № 9
7.	Квартира 2-х комн.	106,1	137 930	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 3, этаж № 1
8.	Квартира 2-х комн.	96,7	125 710	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв. 5, этаж № 1
9.	Квартира 2-х комн.	104,0	135 200	г. Минск, ул. Червякова А.Г., д. 61, кв.10, этаж № 2

1 у.е. равен 1 доллару США по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты.

Организатор аукциона и продавец ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тр. и МКАД, Адм. здание, ком. 302.

Торги состоятся **29 мая 2009 года**, в 11.00, по адресу: Минский район, пересечение Логойского тр. и МКАД, Адм. здание, 3 этаж, зал совещаний.

Для участия в аукционе необходимо перечислить задаток в размере 10 % от стоимости ЛОТА на расчетный счет 3012204960010 в ф-ле МГД-ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 963, УНН 600438617, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район.

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десять) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **28 мая 2009 г.** включительно до 15.00, по адресу: Минский район, пересечение Логойского тр. и МКАД, Адм. здание, 1 (первый) этаж, комната 103.

Тел.: 237 91 32, 8029 757 12 02.

ISSN 1990 - 763X

Расклад руху электрацягнікоў па станцыі Мінск-Пасажырскі з 31 мая 2009 года

Маршрут	Адпр.	Дні	Прыпынкі
На БАРАНАВІЧЫ, БРЭСТ			
Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі			
Баранавічы	4-25	штодня	б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды
Стоўбцы	7-57	штодня	усюды
Брэст	9-51	штодня	усюды
Стоўбцы	12-45	вых.	усюды
Баранавічы	15-36	штодня хутк.	з прыпынкамі па п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, п.п. Дзяржынск, Энергетык, ст. Стоўбцы, ст. Гарадзя, п.п. Пост 1
Брэст	16-17	штодня.	б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны
Стоўбцы	17-45	штодня	усюды
Стоўбцы	18-25	штодня	усюды
Баранавічы	19-01	штодня	усюды
Баранавічы	20-16	штодня	да ст. Стоўбцы — усюды, далей з прыпынкамі па п.п. Варацішча, ст. Гарадзея, п.п. Хвоева, ст. Пагарэльцы і п.п. Пост 1
Стоўбцы	21-47	штодня	усюды
Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ			
Брэст	0-58	штодня	б/п п.п. Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, далей з прыпынкамі па станцыях і п.п. пост № 1
Стоўбцы	5-55	штодня	усюды
Стоўбцы	7-00	штодня	усюды
Баранавічы	7-23	штодня	б/п п.п. Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны
Стоўбцы	8-48	штодня	усюды
Баранавічы	9-06	вых.	б/п Воўчкавічы, Пяцігор'е, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сінява, Асіпоўшчына, Варацішча, Ліпа, Хвоева, Юшкевічы, Пабеда, Крошына
Стоўбцы	9-21	вых.	усюды
Стоўбцы	10-16	суб.	усюды
Стоўбцы	11-15	вых.	усюды
Брэст	11-54	штодня	усюды
Баранавічы	13-56	штодня	усюды
Стоўбцы	14-39	прац.	усюды
Гарадзея	14-39	вых.	б/п Сінява, Асіпоўшчына, Варацішча
Стоўбцы	16-06	пт., нядз.	усюды
Баранавічы	17-09	штодня	б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сінява, Ліпа, Юшкевічы, Пабеда
Стоўбцы	23-00	штодня	б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды.
НА МАЛАДЗЕЧНА			
Адпраўленне са ст. МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ			
Маладзечна	0-25	штодня	б/п п.п. Лябяжы, Татаршчызна, Мясота (акрамя нядзелі), Селівонаўка
Маладзечна	4-36	штодня	б/п п.п. Лябяжы, М.Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі
Маладзечна	5-23	штодня	б/п п.п. Лябяжы
Аляхновічы	6-09	штодня	б/п п.п. Хмелеўка
Маладзечна	6-38	штодня	б/п п.п. Лябяжы, М.Мора, Крыжоўка
Аляхновічы	7-08	штодня	усюды
Аляхновічы	7-20	вых.	усюды
Маладзечна	7-33	штодня	усюды
Аляхновічы	8-06	вых.	усюды
Маладзечна	8-24	штодня	усюды
Аляхновічы	8-46	вых.	усюды
Маладзечна	9-14	штодня	усюды
Аляхновічы	9-43	субб.	усюды
Маладзечна	10-00	штодня	усюды
Аляхновічы	10-24	вых.	усюды
Маладзечна	11-11	штодня	усюды
Аляхновічы	11-48	суб.	усюды
Маладзечна	12-40	штодня	усюды
Маладзечна	13-34	штодня	усюды
Аляхновічы	14-03	нядз.	усюды
Маладзечна	14-37	пт., нядз.	б/п п.п. М.Мора, Раманы, Крыніца, Селівонаўка
Уша	15-05	пт., нядз.	усюды
Маладзечна	15-34	штодня	усюды
Аляхновічы	15-50	пт., вых.	усюды
Аляхновічы	16-10	вых.	усюды
Маладзечна	16-30	штодня	усюды
Аляхновічы	17-18	штодня	усюды
Маладзечна	17-36	штодня	усюды
Аляхновічы	17-58	штодня	усюды
Маладзечна	18-28	штодня	усюды
Аляхновічы	18-58	пт., нядз.	усюды
Маладзечна	19-15	штодня	усюды
Аляхновічы	20-13	штодня	усюды
Маладзечна	20-45	штодня.	усюды
Маладзечна	22-02	штодня.	б/п п.п. Мясота, Татаршчызна, Крыніца, Селівонаўка.

Расклад руху электрацягнікоў па іншых напрамках будзе апублікаваны ў наступным нумары.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

На право заключения договоров аренды земельных участков:

■ **по улице Гагарина** для строительства и обслуживания **гипермаркета**

■ **по улице Ленинской** для строительства и обслуживания **многофункционального комплекса офисно-коммерческих, торговых сооружений с объектами сферы обслуживания**

Аукцион состоится 5 июня 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией «Проектное специализированное бюро» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений **1 июня 2009 года** до 17.00.

Примечание: Полная информация о предметах аукциона, об условиях продажи и об условиях участия в аукционе опубликована в газетах:

- «Звязда» № 65(26423) от 8.04.2009 г., № 67(26425) от 10.04.2009 г.;

- «Веснік Магілева» № 30/1739 от 8.04.2009 г., № 31/1740 от 10.04.2009 г.

Тел. в г. Могилеве 8 0222 22 11 63.

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»

Внеочередное общее собрание состоится

8 июня 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712

Знешні гандаль таварамі і паслугамі Беларусі ў першым квартале скараціўся на 38,7 працэнта да $11,1 млрд

паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Экспарт зменшыўся на 46 працэнтаў і склаў $4,8 млрд, імпарт — на 31,6 працэнта да $6,3 млрд. Па выніках студзеня — сакавіка сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склалася адмоўнае ў памеры $1445 млн (прагноз на 2009 год — адмоўнае сальда ў межах $1470—1500 млн), у тым ліку таварамі — мінус $1780 млн, паслугамі — плюс $335 млн.

Як растлумачылі ў Белстаце, істотнае скарачэнне вартасных аб'ёмаў знешнегандлёвых аперацый у студзені — сакавіку абумоўлена як зніжэннем сярэдніх цэнаў на экспартаваныя і імпартаваныя тавары, так і змяншэннем фізічных аб'ёмаў паставак ва ўмовах сусветнага крызісу. У параўнанні з першым кварталам 2008 года сярэднія цэны экспарту ўпалі на 30,4 працэнта, імпарту — на 18,4 працэнта. Фізічны аб'ём экспарту зменшыўся на 26,5 працэнта, імпарту — на 16,5 працэнта.

Аб'ём знешняга гандлю таварамі за тры месяцы 2009 года склаў $10,1 млрд, у тым ліку экспарт — $4,1 млрд, імпарт — $6 млрд.

Асноўнай крыніцай фарміравання адмоўнага сальда знешняга гандлю з'явіліся экспартна-імпартныя аперацыі з прамежкавымі таварамі (энерганосьбітамі, сыравінай, матэрыяламі і камплектуючымі). Такіх тавараў у рэспубліку ўвезена на $4273,9 млн (зніжэнне на 37,3 працэнта ў параўнанні са студзенем — сакавіком 2008 года), а экспартавана прамежкавых тавараў на $2786,6 млн (зніжэнне на 52 працэнты). Сальда знешняга гандлю энерганосьбітамі склалася адмоўнае ў памеры $837,8 млн.

Экспарт дарожна-будаўнічай тэхнікі склаў 14,1 працэнта да ўзроўню студзеня — сакавіка 2008 года, грузавых аўтамабіляў і седлавых цягачоў — 20,1 працэнта, аўтамабіляў спецыяльнага прызначэння — 27,2 працэнта, прычэпаў і паўпрычэпаў — 23,5 працэнта, трактароў — 57,9 працэнта. У той жа час павялічыўся імпарт металаапрацоўчых станкоў, электрагенератарных установак, кампрэсараў і некаторага іншага абсталявання.

Па выніках студзеня — сакавіка 2009 года дадатнае сальда знешняга гандлю харчовымі таварамі склала $212,1 млн і ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на $74,2 млн. Разам з тым вартасны аб'ём экспарту прадуктаў харчавання знізіўся на 8,7 працэнта. У прыватнасці, скарацілся экспартныя пастаўкі згушчанага і сухога малака, рыбных кансерваў, цукру. У першую чаргу зменшыўся імпарт марожанай рыбы, алеяў, свініны, круп, яблыкаў і груш, безалкагольных напіткаў, сокаў. Па нехарчовай групе спажывецкіх тавараў велічыня адмоўнага сальда дасягнула $288,1 млн.

Аб'ём знешняга гандлю паслугамі Беларусі ў першым квартале 2009 года склаў $1112,2 млн (78,9 працэнта да студзеня — сакавіка 2008 года), у тым ліку экспарту — $723,6 млн (78,5 працэнта), імпарту — $388,6 млн (79,8 працэнта).

БЕЛТА.

ПРАПАНОВА ЗАШКАЛЬВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаспадары пачалі ахвотней згаджацца на зніжкі

У маі рынак арэнды жыллёвых памяшканняў пачаў актывізавацца. Жыллё пачынаюць шукаць студэнты-завочнікі, будучыя абітурыенты, сезонныя будаўнікі і прадаўцы буйных рынкаў. Нягледзячы на гэта, прапанова жылля сёння абганяе попыт больш чым у тры разы. У сувязі з гэтым гаспадары жылля пачалі выкарыстоўваць больш гнуткую цэнавую палітыку. Напрыклад, калі спачатку пэўныя ўладальнікі кватэр выстаўлялі свае аднапакаёвыя кватэры не танней чым за 220 долараў і былі катэгарычна супраць студэнтаў і ўвогуле іншагародніх, то ўжо праз 5—10 дзён умовы арэнды такога жылля істотна мяняліся, а праз два тыдні зніжкі па арэндзе дасягалі 20—40 долараў. Сёння па арэндзе таргуюцца абсалютна ўсе гаспадары кватэр і будучыя кватаранты. Таргуюцца літаральна па кожным пункце ўмоў арэнды і за кожны рубель.

У гэтым выпадку спецыялісты агенцтваў нерухомасці раяць патэнцыйным кватарантам больш прафесійна падыходзіць да афармлення здзелак арэнды жылля. Калі кватэра здаецца даволі танна, але з вялікай перадаплатай, то будучаму кватаранту абавязкова трэба ўдакладніць канчатковы тэрмін арэнды і далейшыя ўмовы аплаты жылля. Рабіць гэта трэба ў пісьмовай форме, каб у гаспадара кватэры не з'явілася спакусы праз пэўны час неабгрунтавана павялічваць цэннік арэнды або ўвогуле памяняць кватаранта. Каб не трапіць у складаную сітуацыю, кватаранту не лішне будзе пацікавіцца ў арэндадаўцы аб наяўнасці іншага жылля (акрамя дачы) або саўладальнікаў кватэры з боку былой жонкі, мужа, дзяцей.

Арэнда будзе таннець і летам

Не вельмі простая эканамічная сітуацыя ў краіне будзе спрыяць далейшаму патанненню арэнды жылля ў сталіцы. Гэтую тэндэнцыю будзе «падштурхоўваць» павелічэнне аб'ёмаў на рынку арэнды сезоннага жылля з боку дачнікаў. Эксперты агенцтва «Час пік» упэўненыя, што стандартныя кватэры ў спальных раёнах будуць працягваць таннець на працягу чэрвеня і паловы ліпеня. Сярэдні кошт арэнды на піку патаннення можа знізіцца да 150—160 долараў плюс квартплата. Далейшае доўгатэрміновае прагназаванне цэнавых ваганняў на рынку арэнды будзе залежаць ад многіх фактараў, бо застаецца адкрытым пытанне аб тым, колькі тады будзе каштаваць замежная валюта і якія сярэднія заробкі будуць атрымліваць жыхары і сезонныя работнікі сталіцы. Другім фактарам у другой палове ліпеня і ў жніўні на рынку арэнды можа стаць новая хваля першакурснікаў, якія звычайна павялічваюць попыт на кватэры. Які з гэтых фактараў у жніўні будзе мацнейшы, сёння казаць пакуль рана.

Сезон дачнага адпачынку толькі пачынаецца

Усё часцей пры планаванні летняга адпачынку мае знаёмыя пачалі карыстацца фразай аб тым, што не трэба нам бераг турэцкі, бо дома нам утульней і... танней. У час фінансавага крызісу вялікая колькасць жыхароў Мінска з сярэднімі заробкамі канчаткова адмовіліся ад замежных ваяжаў, дзе, да таго ж, недзе «гуляе» так званы свіны грып. Нядрэнным попытам сёння карыстаюцца пуцёўкі у айчынныя санаторыі і дамы адпачынку. Між іншым пуцёвак на ўсіх не хапае, ды і адпачываць «па графіку» не ўсе згодныя.

У апошнія гады стала папулярным здымаць на месяц ці на некалькі тыдняў невялікую дачу, садовы домік ці хатку ў вёсцы побач з лесам, возерам ці ракой. Такі сезон толькі пачынаецца, таму ў агенцтвах попыт і прапанова па такім жыллі яшчэ не вельмі вялікія. Аднак зацікӑленасць сярод кліентаў ёсць. Спецыялісты адзначаюць, што максавая прапанова такой «зялёнай нерухомасці» прыпадае на чэрвень, а максімальны попыт — у ліпені і жніўні. Тут кліенту галоўнае — паспець злавіць «удачу за хвост», каб быў вялікі выбар якасных «фазэндаў», пашанцавала з надвор'ем, ды і цэны яшчэ не «кусаліся».

Добрым попытам у жыхароў сталіцы карыстаюцца невялікія, але з выгодамі дачныя домкі на адлегласці да 30 кіламетраў ад Мінска. Цяпер такія домкі прапаноўваюцца ў арэнду па кошце ад 100 да 150 долараў за месяц. Нядрэнныя жыллёвыя пабудовы ў садовых таварыствах у адлегласці да 60 кіламетраў ад Мінска каштуюць звычайна ад 60 да 80 долараў, а далёкія дачныя домкі можна адшукаць нават не даражэйшыя за 50 долараў за месяц. Аматарам свабоднага адпачынку прапаноўваюцца нядрэнныя жылыя домкі з бытавым абсталяваннем побач з прыбярэжнай зонай каля возера Нарач або ў сістэме Браслаўскіх азёраў. Там жылыя памяшканні каштуюць да 300 долараў у месяц. Свабодныя домкі ў гэтых шыкоўных месцах яшчэ пакуль ёсць.

Сяргей КУРКАЧ.

МЗС

Беларусь не збіраецца выбіраць паміж інтарэсамі ў СНД і ўдзелам ва «Усходнім партнёрстве»

Беларусь не збіраецца рабіць выбар паміж свайімі інтарэсамі ў СНД і будучым удзелам ва «Усходнім партнёрстве». Аб гэтым заявіў на брыфінгу, адказваючы на пытанні журналістаў, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Папоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Гэтыя два вектары нашай знешняй палітыкі маюць рынцыповую важнасць для краіны. Беларусь прадоўжыць прытрымлівацца гэтай пазіцыі, і, як мы разумеем, у нашых партнёраў яна знаходзіць усё большае разуменне», — сказаў Андрэй Папоў.

Паводле яго слоў, удзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» адпавядае інтарэсам беларускага боку. «Як і раней, мы рынцыпова настойваем на тым, што далейшая эвалюцыя ініцыятывы не павінна быць накіравана супраць нейкіх трэціх краін. Наадварот, мы цвёрда перакананы, што яна мае патэнцыял для таго, каб на ўзаемавыгаднай аснове забяспечваць удзел і іншых краін у тых канкрэтных праектах, якія будуць у рамках гэтай праграмы. Таму Беларусь прадоўжыць працаваць у гэтым напрамку», — адзначыў прэс-сакратар МЗС.

Беларусь гатова да паляпшэння адносінаў са Злучанымі Штатамі Амерыкі як і раней, але не любой цаной. «Мы зыходзім з таго, што беларуска-амерыканскія ўзаемаадносіны маюць даволі істотнае значэнне для абодвух бакоў, і таму лічым, што ў абодвух бакоў павінна быць разуменне таго, што гэтыя адносіны неабходна паляпшаць», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік МЗС.

«Мы гатовы як і раней да паляпшэння такіх адносінаў, але не любой цаной. Мы зыходзім з таго, што тыя абмежавальныя падыходы эканамічнага характару, якія былі прыняты пэўны час таму з боку адміністрацыі ЗША, павінны быць адменены. Упэўнены, што гэта адкрые для нас магчымасць пачаць новую старонку ў нашым двухбаковым дыялогу», — сказаў Андрэй Папоў.

Цана расійскага газу для Беларусі з 1 ліпеня складзе $102-103 за 1 тыс. куб.м

Кошт расійскага прыроднага газу для Беларусі з 1 ліпеня будзе складаць $102-103 за 1 тыс. куб.м. Аб гэтым паведаміў журналістам, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка.

«Па той формуле, якая прывязана да вытворных нафты, газу і мазуту, зыходзячы з цэнаў на нафту і тыя вытворныя, што былі ў першым квартале і складваюцца ў другім квартале (разлік бярэцца па апошніх трох кварталах), цана з 1 ліпеня на газ для Беларусі разлічваецца на ўзроўні $102-103», — сказаў Уладзімір Сямашка. Ён нагадаў, што з 1 студзеня Беларусь плаціла $210,3 за 1 тыс. куб.м, сёння гэта цана складае $147,2.

Уладзімір Сямашка падкрэсліў, што ў Беларусі няма запасычанасці ў аплаце расійскага газу. «За папярэднія тры месяцы мы разлічыліся поўнасцю, зыходзячы з сярэдняй цаны $150, якая разлічваецца па году», — сказаў ён. Да 23 мая краіна павінна разлічыцца за газ, спажыты ў красавіку.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ УПРАВЛЯЮЩЕГО В ДЕЛЕ О БАНКРОТСТВЕ РУП «БАРАНОВИЧСКАЯ ФАБРИКА ПОШИВА И РЕМОНТА ОБУВИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. М. Богдановича, д. 11а, в составе: здания специализированные для производства текстильных, швейных и кожаных изделий (565,9 кв.м, 684,7 кв.м, 639,5 кв.м), здание специализированное иного назначения (290,6 кв.м), склады-гаражи (280,1 кв.м), проходная (13,2 кв.м), заборы железобетонный (дл. 40,58 м) и металлический (дл. 50,8 м), дворовое асфальтовое покрытие (пл. 1062 кв.м). Площадь земельного участка 0,2969 га. Начальная цена снижена на 50 % и составляет 1 145 284 доллара США с НДС. Задаток в сумме 100 000 долларов США перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Объекты продаются без условий. Результаты аукциона оформляются протоколом. Договор купли-продажи подписывается сторонами в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта – в течение 30 дней с даты проведения торгов. Все платежи производятся в бел. руб. по курсу НБ РБ на дату платежа. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **05.06.2009 г.** в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, 11а. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.06.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (8029) 6332490.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Предложение о покупке акций ОАО «Минскводстрой»

1. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются	Открытое акционерное общество «Минскводстрой», 220090 г. Минск, ул. Широкая, 4
2. Количество приобретаемых акций	1500 простых обыкновенных акций с целью аннулирования и 352 простые обыкновенные акции для продажи инвестору
3. Цена приобретения	352 000 рублей за 1 акцию
4. Сроки, форма и порядок оплаты акций	Оплата акций осуществляется денежными средствами через бухгалтерию Общества в течение 15 дней со дня заключения договоров купли-продажи акций
5. Адрес, по которому будут заключаться договора купли-продажи акций	г. Минск, ул. Шафарнянская, 11
6. Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	с 01.06.2009 г. по 01.09.2009 г.
7. Даты начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи)	с 01.09.2009 г. по 15.09.2009 г.

Генеральный директор С.Г. Павлович
Главный бухгалтер В.В. Евсиевич

УНП 600013209

Як нас дураць

Пад гіпнозам лячылі хваробу вялікімі грашыма

18 мая 54-гадовая магіляўчанка стала ахвярай махлярак, якія абяцалі ёй вылячэнне ад хваробы. Каштаваў сеанс варажбы 450 тысяч беларускіх рублёў і амаль 9 тысяч долараў. Усе сямейныя зберажэнні яна аддала ў рукі незнаёмай жанчыны, якая назвалася вядомай лекаркай і зрабіла на яе вялікае, хутчэй за ўсё, гіпнатычнае ўражанне.

Як расказалі ў Ленінскім РАУС, усё пачыналася будзённа. Каля гасцініцы ў цэнтры Магілёва да магіляўчанкі звярнулася жанчына 45-50 гадоў і загаварыла як з даўняй знаёмай. Што ж, памылкі здараюцца: яна сказала, што бачыць суразмоўніцу першым разам. Але незнаёмка нечакана паведаміла жанчыне пра яе праблемы са здароўем і настойліва прапанавала дапамогу.

У міліцыі пацярпелая жанчына потым расказвала, што стала млявай і пайшла за «лекаркай», хоць і сама не разумела навошта ёй гэта. Увогуле яна правяла ў такім дзіўным стане дзве гадзіны.

У сцэнарыі махлярак была варажба з вузламі на вяроўцы, з яйкамі ў пакеце і, нарэшце, з вялікімі грашыма, якімі нібыта можна вылечыць хваробу. Як у сне, жанчына сабрала беларускія рублі, што былі ў доме, а потым зняла з валютнага рахунку ўсе зберажэнні.

У скверы фальшывая лекарка і яе напарніца паклалі грошы ў кулькі, нешта з імі рабілі, а потым аддалі ў рукі магіляўчанкі. Яны загадалі прайсці праз тры перакрыжаванні і не азірацца, а потым паехаць спакойна дадому і разгарнуць кулькі толькі назаўтра раніцай.

Жанчына апамяталася раней і звярнулася па дапамогу ў міліцыю. Следчыя кажуць, што сцэнарый зняцця псоты альбо вылячэння хваробаў грашыма падобны на выпадкі, якія здараліся і раней. Хутчэй за ўсё, махляркі «гастралююць» і з вялікімі грашыма хутка пакідаюць месца злачынства. Іх шукаюць, але і людзей папярэджваюць быць больш уважлівымі і асцярожнымі з незнаёмцамі.

Алена КАЗЛОВА.

Калі вакол кашляюць і чхаюць, насіце маску

Вірус грыпу А (H1N1), які ўпершыню выявілі ў Мексіцы, працягвае «заваёўваць» новыя тэрыторыі. Выпадкі захваральнасці на гэты высокапатагенны грып ужо зарэгістраваны ў 41 краіне. Агульная колькасць выпадкаў складае 10.243, з іх 80 — лятальных. У асноўным грып рэгіструецца ў ЗША, Мексіцы, Канадзе. У Еўропе найбольшая колькасць выпадкаў зарэгістравана ў Іспаніі і Вялікабрытаніі — да 100. У нашых найбліжэйшых суседзяў выяўлены толькі адзін выпадак у Польшчы.

Беларусь гэта небяспека пакуль абышла. Аднак нашы эпідэміёлагі гатовыя, калі сітуацыя зменіцца, справіцца з ёй. Напрыклад, як адзначыў дырэктар НДІ эмідэміялогіі і мікрабіялогіі Леанід Цітоў, у рамках дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Інфекцыйныя захворванні і мікрабіялагічныя біятэхналогіі» супрацоўнікі інстытута ў найкарацейшыя тэрміны распрацавалі і апрабавалі ў лабараторных умовах прэпараты, якія дазваляюць дыягнаставаць грып А (H1N1).

Улічваючы пагрозу «свінога грыпу», медыка-санітарныя службы рэспублікі не рэкамендуюць тым установам, якія арганізуюць і ажыццяўляюць дзелавыя і турыстычныя паездкі, культурны абмен, наладжваць наведванне краін, дзе рэгіструецца і распаўсюджваецца грып А (H1N1). — Мінадукацыі, — гаворыць галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Іна Карабан, — дае нам інфармацыю аб тым, у якія краіны плануецца вывезці дзяцей на адпачынак і аздараўленне. Згодна з ёй мы папярэджваем, у якія мясціны ехаць непажадана, бо там ёсць высокая колькасць захваробаў.

Аднак, калі адмяніць паездкі немагчыма, трэба захоўваць меры асабістай прафілактыкі. Галоўная з іх — практычна ад усіх інфекцый і асабліва ад грыпу — частае мыццё рук. Трэба таксама радзей наведваць масавыя мерапрыемствы, пазбягаць кантактаў з асобамі, у якіх ёсць нейкія, магчыма, вірусныя інфекцыі. А ў выпадках, калі вакол шмат народу, які кашляе і чхае, трэба насіць маску.

Вольга ШАЎКО.

Пастанова Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Канюка А.У.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Канюка Аляксандра Уладзіміравіча.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Б. БАТУРА

19 мая 2009 года, г. Мінск. № 84—СР4/П

Сузор'е талентаў фестывальнай Магілёўшчыны

Сёння, Магілёўская вобласць дае ў Мінску справаздачны канцэрт творчых сілаў. Ён пачнецца а 18-й гадзіне ў Палацы рэспублікі. У праграме канцэрта будуць прадэманстраваны галоўныя музычныя святы рэгіёна: рэтра-фестываль «Залаты шлягер», дзіцячы фестываль «Залатая пчолка», фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа» і іншыя. Справаздачны канцэрт вядучыя музыканты і артысты Магілёўшчыны прысвяцілі роднай Беларусі і 65-годдзю вызвалення краіны ад фашысцкіх захопнікаў.

Ул. інф.

Абзац

◢ У кар'еры «Старовіна» каля Гродна выяўлены 200-кілаграмовы чорны крэмніевы валун і два — па 70-80 кг. Гэта, па словах спецыялістаў, вельмі рэдкія камяні, якія зямля захоўвала ў сваіх нетрах сотні мільёнаў гадоў. Валуны плануецца перадаць у мясцовы археалагічны музей для далейшага вывучэння. Лічыцца, што чорны крэмень валодае моцным энергетычным полем. Вырабы з каменя выкарыстоўваюць як амулеты.

◢ **Начальнік аднаго з аддзелаў Полацкага гарвыканкама затрыманы па падазрэнні ў атрыманні хабару ў памеры Br3,5 млн., паведамілі БЕЛТА ў пракуратуры горада. Грошы прызначаліся чыноўніку за спрыяльнае вырашэнне пытання, звязанага з перадачай у арэнду камерцыйнай кампаніі памяшкання.**

◢ Бабруйскі міжгарнізонны ваенны суд асудзіў да 6 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці палкоўніка — былога камандзіра адной з вайсковых часцей. За хабар у памеры $360 ён размяшчаў на тэрыторыі падпарадкаванай яму вайсковай часці грузавы транспарт камерцыйнай фірмы без заключэння дамовы.

◢ **Буйная партыя кантрабанды на суму больш за Br160 млн. выяўлена ў Кобрынскім раёне. У хляве непрацуючага жыхара вёскі Барысаўка выяўлена 50 TV-цюнераў, 25 буйнагабарытных сумак з адзеннем і абуткам, 231 бутэлька спіртных напояў розных найменняў і 6 пакетаў віна. Складзены адміністрацыйны пратакол.**

Поўны абзац

◢ Жарт 4-гадовай віцябчанкі стаў прычынай выкліку выратавальнікаў для яе мамы. Пакуль жанчына развешвала бялізну на балконе, малая вырашыла закрыць дзверы на засаўку. Калі ж маці паспрабавала вярнуцца ў кватэру, то ў дзяўчынкі не хапіла сілаў, каб адчыніць засаўку. Разам з жартаўніцай у доме заставалася гадавалае дзіця. Спусціцца з балкона 7-га паверха, дзе была зачыненая жанчына, было немагчыма, разбіць акно ў кватэры палонніца не рашылася. На шчасце, мужчына, які праходзіў міма, пачуў заклікі на дапамогу і выклікаў выратавальнікаў. З дапамогай 50-метровай лесвіцы яны падняліся на другі балкон, праніклі ў кватэру і адчынілі дзверы.

◢ **У сталіцы Кубані адбыўся кур'ёзны выпадак — выкраданне аўто «ў квадраце». Жыхар Краснадара, уладальнік Mitsubishi, выпіваў са сваім знаёмым. Дачакаўшыся, пакуль аўтаўладальнік засне, яго п'яны сябар выкраў «японку». Аднак па дарозе ён сустрэў знаёмага, з якім таксама «дзюбнуў», пасля чаго заснуў. Знаёмы скарыстаўся выпадкам і скраў іншамарку ў злодзея машын, не ведаючы, што аўтамабіль ужо раз скрадзены. У выніку п'янага вадзіцеля затрымалі супрацоўнікі ДАІ, якія пры высвятленні сітуацыі знайшлі гаспадара аўтамабіля. Узбуджаны крымінальныя справы ў дачыненні да абодвух злодзеяў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ОАО «БЕЛТРАНСГАЗ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества с применением метода понижения начальной цены.

Объект продажи: автокран КС-3577-3-1 г.н. 71-86 МБН (введен в эксплуатацию 27.02.1990, предназначен для производства монтажных и погрузочно-разгрузочных работ с обычными грузами на рассредоточенных объектах, максимальная грузоподъемность – 14 тп, максимальный грузовой момент – 441 кНм, максимальная высота подъема – 14,5 м, вылет минимальный/максимальный – 3,2/13,0 м).

Начальная цена – 40 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

Минимальная цена продажи – 24 438 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка в размере 4 000 000 белорусских рублей, а также платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток и плата за участие в аукционе перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» №3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 5 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Аукцион состоится 23 июня 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 июня 2009 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227-48-36, (017) 227-40-22 –
УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017) 503-76-73, 219-13-22 - ОАО «Белтрансгаз».
Интернет: www.mgcn.by

ИЗВЕЩЕНИЕ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» ПРОВОДИТ 8 ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ 23 ИЮНЯ 2009 ГОДА

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
30.	Грузовой Урал-4320 ш. 23607, дв. 406423	г. Минск в/

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

22 МАЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 19 (15573)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ЦТ адкрыла дарогу ў ВНУ выхаванцам сельскіх школ

Цэнтралізаваны адбор прэтэндэнтаў на навучанне ў ВНУ або сярэдніх спецыяльных навучальных установах даўно стаў для Беларусі нормай. А вось у нашых суседзяў-расіян кіпяць нежартоўныя жарсці. Нягледзячы на шматлікія пратэсты, якія гучалі з розных бакоў, адзіны дзяржаўны экзамен (АДЭ), які на працягу васьмі гадоў меў эксперыментальны статус, стаў з 2009 года ў Расіі абавязковай формай выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы і прыёму ў ВНУ. Папярэдні правядзення адзінага дзяржэкзамену Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскай думкі агучыў звесткі маштабнага даследавання, мэтай якога было атрымаць партрэт тыповага прыхільніка і праціўніка АДЭ. Вынікі даследавання, у прыватнасці, паказалі, што сярод прыхільнікаў АДЭ, як правіла, выдатнікі і тыя, хто вучыцца добра, якія адказна ставяцца да сваёй вучобы і вераць у свае сілы, а таксама школьнікі, у якіх брат, сястра ці сябар ужо здавалі гэты экзамен. Падтрымліваюць АДЭ таксама перадавыя педагогі, гатовыя павышаць свой прафесійны ўзровень, якія не баяцца знешняй ацэнкі вынікаў сваёй работы, і тыя, хто выступае за барацьбу з карупцыяй на выпускных экзаменах у школе і паступленні ў ВНУ. Сярод прыхільнікаў АДЭ аказаліся таксама бацькі з высокімі адаптыўнымі якасцямі, перакананыя, што АДЭ палегчыць паступленне ў ВНУ іх дзяцей, якія мяркуюць, што гэты экзамен матывуе настаўнікаў павышаць сваю кваліфікацыю, а іх дзяцей — больш адказна ставіцца да вучобы.

Сярод праціўнікаў АДЭ аказаліся «двоечнікі», пазбаўленыя цяперашняй магчымасці спісаць ці атрымаць падказку падчас экзамену, дзеці з павышаным узроўнем трывожнасці і тыя, хто лічыць, што «раней можна было быць залічаным у ВНУ заплаціўшы за паступленне». Не падтрымліваюць АДЭ і настаўнікі, якія аддаюць перавагу старым метадам работы і баяцца любых новаўвядзенняў, а таксама бацькі, якія адчуваюць недахоп праўдзівай інфармацыі аб адзіным дзяржаўным экзамене. У ходзе даследавання было выяўлена, што ў грамадстве існуе глыбокае разуменне неабходнасці сістэмных зменаў у сферы адукацыі. У сувязі з гэтым АДЭ прызнаецца эфектыўным інструментам выяўлення праблемных зонаў у адукацыі з адной агаворкай «ідэя здачы АДЭ — добрая, неабходна толькі дапрацаваць працэдуру яго здачы». Акрамя таго выпускнікі гэтага года аднадушныя ў тым, што нервозныя абставіны вакол АДЭ ствараюцца дарослымі. Больш за тое, нядаўна група бацькоў спрабавала аспрэчыць у Вярхоўным Судзе законнасць загада Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі аб правядзенні адзінага дзяржаўнага экзамену. Бацькі выступілі супраць выкарыстання на экзамене стандартызаваных формы, але іх іск быў адхілены. Зразумела, што ўсе жарсці, што кіпяць у Расіі вакол адзінага дзяржаўнага экзамену, тым ці іншым чынам закранаюць і рэпутацыю цэнтралізаванага тэсціравання, тым больш што апанентаў у ЦТ таксама хапае.

На думку **намесніка міністра адукацыі нашай краіны Аляксандра ЖУКА**, практыка Беларусі сведчыць аб тым, што ў цэлым ЦТ выконвае пастаўленыя перад ім задачы — стварае роўныя і справядлівыя ўмовы для ўсіх абітурыентаў на ўваходзе ў ВНУ. Лепшае пацвярджэнне — павелічэнне колькасці сярод студэнтаў выхадцаў з сельскай мясцовасці. Калі чатыры гады таму сярод першакурснікаў ВНУ колькасць выпускнікоў сельскіх навучальных устаноў складала 14 працэнтаў, два гады таму — 16 працэнтаў, то летась іх прадстаўніцтва павялічылася ўжо да 20 працэнтаў. Такім чынам ЦТ адкрыла дарогу да атрымання вышэйшай адукацыі самым таленавітым выхаванцам педагогаў сельскіх навучальных устаноў. А для Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта раптам стала актуальнай праблема забеспячэння студэнтаў месцамі ў інтэрнатах, таму што калі раней яго студэнцкую аўдыторыю складалі пераважна мінчане і жыхары Мінскай вобласці, то цяпер ён стаў даступны для абітурыентаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Больш за тое, у БДМУ сталі паступаць нават маладыя людзі з тых гарадоў, дзе ёсць свае медыцынскія ўніверсітэты.

— Зразумела, што можна шмат разважаць аб тым, што для выкладчыкаў маюць важнае значэнне асабістыя стасункі з абітурыентам, для іх важна пачуць, ці ўмее той абгрунтаваць свае думкі, прасачыць логіку яго разважанняў, аднак любы вусны экзамен аўтаматычна цягне за сабой рызыку несуб'ектыўнай ацэнкі, — падкрэслівае Аляксандр Жук, — і мы гэта добра разумеем. Пры ўсіх «мінусах» ЦТ гэта форма адбору прэтэндэнтаў на навучанне ў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах пакуль самая аптымальная. А для таго, каб не пераўтварыць вучэбны працэс у школе ў муштру па тэстах, мы пакінулі на выхадзе са школы абавязковы вусны экзамен.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РЭКТАР БДУ НЕ РАІЦЬ КІРАВАЦЦА ПАЧУЦЦЁМ ТАВАРЫСКАСЦІ ПРЫ ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ

Прыёмная кампанія-2009 ужо стартавала, аднак гэта не значыць, што для выпускнікоў школ пытанне будучай прафесіі канчаткова вырашана. Як не памыліцца пры выбары, што новага чакае абітурыентаў і студэнтаў БДУ сёлета, нарэшце, чаму ў БДУ цікава вучыцца — пра гэта размова з рэктарам вядучага класічнага ўніверсітэта краіны Сяргеем АБЛАМЕЙКАМ.

— Сяргей Уладзіміравіч, калі, на ваш погляд рэктара, вучонага і бацькі дваіх ужо дарослых дзяцей, трэба пачынаць выбар будучай прафесіі?

— Я думаю, вызначацца трэба ў апошніх двух-трох класах школы. У ідэале, у старшакласніка ўжо павінна сфарміравацца цяга да пэўнага прадмета. Напрыклад, я ўжо ў 9-м класе разумеў, што жыццё маё будзе звязана з матэматыкай і ішоў да гэтага мэтанакіравана. Іншая справа — як гэту цягу сфарміраваць. Тут, безумоўна, адыгрывае сваю ролю і школа, і асяроддзе, у якім расце дзіця. Бацькі таксама павінны дапамагчы. Але ім трэба быць асцярожнымі і калі даводзіцца ціснуць, то трэба рабіць гэта мякка. Бо будучая прафесія дзіцяці — вялікая адказнасць і для бацькоў. Важна, каб паміж дзецьмі і бацькамі было паразуменне. Мой сын закончыў школу з залатым медалём і быў пераможцам алімпіяд, яму заставалася толькі занесці дакументы ў прыёмную камісію. Ён панёс іх туды, куды я раіў, і я вельмі спадзяюся, што ён ніколі пра гэта не пашкадуе. Але ён час ад часу мне нагадвае, што гэта было, хутчэй, маё рашэнне, чым яго.

— Сёння абітурыенты часам да апошняга дня ўступнай кампаніі не ведаюць, на якую спецыяльнасць ім падаць дакументы...

— Ёсць у гэтым і мінусы, але ёсць і плюсы. Сёння абітурыент можа ўзважыць свае шанцы на паступленне на той ці іншы факультэт альбо спецыяльнасць, сітуацыя, якая складваецца з прахаднымі балламі, стала празрыстай, усё бачна як на далоні, толькі сачы. І калі ты хочаш стаць, напрыклад, праграмістам, то няма заганы ў тым, што з аднаго ВНУ перакінеш дакументы ў іншы, дзе атрымаеш тую ж спецыяльнасць. Горш, калі чалавек перакідвае дакументы з адной толькі мэтай — быць залічаным, а на якую спецыяльнасць — не важна. Гэта можа прывесці да прыкрай памылкі. Як, дарэчы, і кіраванне пачуццём таварыскасці: куды сябры, туды і я.

Мы са свайго боку імкнёмся падобныя памылкі папярэдзіць. Дні адчыненых дзвярэй нашы факультэты і інстытуты праводзяць, як правіла, у снежні-студзені і сакавіку-красавіку. У БДУ ёсць падрыхтоўчае аддзяленне, падрыхтоўчыя курсы розных тэрмінаў і формаў навучання і школы для абітурыентаў, а таксама для вучняў старэйшых і сярэдніх класаў. Напрыклад «Школа юных матэматыкаў і інфарматыкаў» запрашае дзяцей з 5-га класа, школа «Юных географаў» — з 7-га.

Мы супрацоўнічаем са школамі, самі выязджаем у глыбінку. Напрыклад, нядаўна я ездзіў у свой родны Воранаўскі раён на Дзень выпускніка, дзе тлумачыў бацькам і дзецям усё пра паступленне ў БДУ. 25 мая на нашым сайце адбудзецца інтэрнэт-канферэнцыя з удзелам кіраўніцтва ўніверсітэта і прадстаўнікоў прыёмнай камісіі.

Акрамя таго, у нашым Цэнтры праблем чалавека распрацавана ўнікальная камп'ютарная дыягностыка для тэсціравання старшакласнікаў і выдачы рэкамендацый па выбары прафесіі і ВНУ. Гэта дыягностыка не толькі ўлічвае ўзровень атрыманых ведаў і інтарэс да той альбо іншай дзейнасці, але і прыродныя характарыстыкі, якія вызначаюць паспяховасць чалавека ў прафесіі. Гэта тэсціраванне могуць прайсці ўсе ахвотныя, асабліва яно будзе карыснае тым, хто не можа вызначыцца, альбо хто мае разыходжанне з бацькамі ў поглядах на сваё будучае, а таксама для тых, хто вырашыў атрымаць другую вышэйшую адукацыю.

— Што новае чакае абітурыентаў БДУ сёлета?

— У 2009 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт упершыню будзе ажыццяўляць набор на спецыяльнасці «лагістыка», напрамкі «ядзерная фізіка і тэхналогіі» спецыяльнасці «фізіка», на спецыялізацыі «радыяхімія» і «радыяцыйная хімія».

Акрамя таго, адзін раз у пяць гадоў мы набіраем абітурыентаў на спецыяльнасць «класічная філалогія». Студэнты вывучаюць тут

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

лацінскую і грэчаскую мовы, літаратуру і культуру. Сёлета адбыўся выпуск студэнтаў, якія паступілі на гэту спецыяльнасць у 2004 годзе. Усе яны атрымалі размеркаванне.

Упершыню на завочную форму навучання мы будзем набіраць на напрамак «інфармацыйныя тэхналогіі» спецыяльнасці «матэматыка». Нарэшце для тых, хто хоча атрымаць другую вышэйшую адукацыю, аб'яўлены набор на новую спецыяльнасць «кіраванне інавацыйнымі працэсамі».

— «Лагістыка» — слова для нас яшчэ не звыклае...

— Тым не менш, яно вядомае з часоў Візантыйскай імперыі. Яно ўпершыню было выкарыстана ў трактаце па ваенным мастацтве. Аднак у сучасным свеце тэрмін «лагістыка» звязаны часцей за ўсё з бізнэсам. З'яўленне новай спецыяльнасці выклікана сучасным развіццём эканомікі, неабходнасцю аптымальнага кіравання прамысловай інфраструктурай, транспартнымі, інфармацыйнымі, фінансавымі патокамі. Геапалітычнае становішча Беларусі, якое звязвае Заходнюю Еўропу з Расіяй, робіць пабудову і развіццё сучасных лагістычных сістэм вельмі перспектыўным напрамкам.

Лагістычная сістэма прадугледжвае арганізацыю ўзаемадзеяння прадпрыемстваў-вытворцаў, транспартных, гандлёвых арганізацый, сістэмы сэрвісу.

Падрыхтоўка спецыялістаў носіць міждысцыплінарны характар. Спецыяліст па лагістыцы павінен валодаць спецыяльнымі ведамі як па эканоміцы, кіраванні, фінансавым менеджменце, так і ў галіне інфармацыйных і прамысловых тэхналогій.

Каб паступіць на гэту спецыяльнасць, абітурыенты павінны здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай альбо рускай мове, матэматыцы і замежнай мове.

— Як вы думаеце, ці не будзе складанасці з наборам студэнтаў на спецыяльнасці, звязаныя з атамнай энергетыкай. Усё ж такі, у свядомасці абывацеля само гэта словазлучэнне моцна звязана з адмоўнымі эмоцыямі.

— Думаю, праблем з наборам тут не будзе. Па-першае, сённяшнія выпускнікі — гэта ўжо новае пакаленне, свабоднае ад штампаў у свядомасці. Па-другое, гэта вельмі перспектыўныя і цікавыя спецыяльнасці, блізкія да навукі, яны будуць запатрабаваныя і добра аплачвацца.

Безумоўна, чарнобыльская катастрофа — гэта трагедыя для беларускага народа. Разам з тым, мірнае выкарыстанне атамнай энергетыкі з'яўляецца неабходнай умовай далейшага развіцця нашай краіны і забеспячэння яе энергетычнай бяспекі. Фізічны факультэт БДУ актыўна ўключыўся ў рэалізацыю дзяржаўнай праграмы па падрыхтоўцы спецыялістаў па атамнай энергетыцы. Ужо ў найбліжэйшы час з'явяцца такія спецыялізацыі, як «фізіка ядзерных рэактараў і атамных энергетычных установак», «спектраметрыя і дазіметрыя ядзерных выпраменьванняў», «радыяцыйнае матэрыялазнаўства», «ядзерная бяспека» і іншыя.

Падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях звязана з неабходнасцю арганізацыі навуковага суправаджэння, функцыянавання беларускай атамнай станцыі, якая будзе будавацца па новых тэхналогіях у адпаведнасці з жорсткімі патрабаваннямі бяспекі.

— Сяргей Уладзіміравіч, скажыце, якія шанцы ў іншагародняга студэнта-першакурсніка БДУ атрымаць месца ў інтэрнаце?

— Сёння ў інтэрнатах БДУ пражывае прыкладна 5 400 іншагародніх студэнтаў, гэта каля паловы ад агульнай колькасці тых, хто мае патрэбу. Пры гэтым кожнае чацвёртае месца аддаецца першакурснікам. У наступным годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю два інтэрнаты, а гэта больш чым 2200 месцаў. Такім чынам, пасля ўвядзення ў эксплуатацыю новых інтэрнатаў амаль трое з чатырох студэнтаў, якія маюць патрэбу, будуць забяспечаны інтэрнатам, і практычна ўсім іншагароднім першакурснікам будзе дадзена месца.

— Вядома, што БДУ актыўна супрацоўнічае з замежнымі ВНУ. Асабіста вамі ўжо быў падпісаны шэраг новых пагадненняў. Раскажыце, што стаіць за гэтым супрацоўніцтвам і якія з сумесных праектаў найбольш цікавыя?

— Дагаворы аб супрацоўніцтве даюць дадатковыя магчымасці для правядзення сумесных навуковых даследаванняў, арганізацыі стажыровак і вучэбных практык студэнтаў, абмен выкладчыкамі. На сёння БДУ мае 189 дагавораў з партнёрамі з 49 краін. Ужо сёлета падпісана 10 новых пагадненняў з замежнымі ВНУ, у тым ліку з Гаванскім універсітэтам, Балтыйскай міжнародай акадэміяй (Латвія), Тэхнічным універсітэтам Лодзі, Ханойскім універсітэтам, Еўразійскім універсітэтам імя Гумілёва (Казахстан), Жылінскім універсітэтам (Славакія).

Пасля падпісання дагавора з Жылінскім універсітэтам прайшло толькі два месяцы, і мы ўжо прадставілі для фінансавання ў Еўрапейскую камісію два сумесныя праекты: адзін для сёмай рамачнай праграмы ЕС, прысвечаны апрацоўцы выяў пры дыягностыцы ракавых захворванняў, а другі праект у рамках ТЭМПУС — адукацыйная праграма па развіцці інфармацыйных тэхналогій.

Асаблівую цікавасць мае для нас падпісаны Мемарандум аб намерах па ўзаемадзеянні і супрацоўніцтве паміж Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя Ламаносава і БДУ ў галіне касмічнай адукацыі і навукі. Першым канкрэтным крокам у гэтым кірунку стане стварэнне і запуск універсітэцкага навукова-адукацыйнага мікраспадарожніка, які будзе сумесна распрацаваны намаганнямі БДУ і МДУ. Галоўныя выканаўцы праекта — НДІ ядзернай фізікі МДУ і Цэнтр аэракасмічнай адукацыі БДУ.

— Гэты праект можна назваць грандыёзным.

— Так. У нас нямала падобных праектаў, якія ўжо рэалізуюцца, і тых, што запланаваны. Гэта навуковыя, адукацыйныя і вытворчыя праекты. Ёсць дамоўленасць з Акадэміяй навук наконт суперкамп'ютарнага кластара. Нашы распрацоўкі выклікалі цікавасць удзельнікаў і наведвальнікаў Гановерскага міжнароднага прамысловага кірмашу, які адбыўся ў красавіку. Дзелегацыя ўніверсітэта правяла 25 сустрэч і перамоў з прадстаўнікамі фірмаў, маркетынгавых цэнтраў і цэнтраў трансфера тэхналогій з 13 краін...

— А з тых праектаў БДУ, што ўжо прыносяць краіне дывідэнды, якія найбольш выразныя?

— З тых, што былі рэалізаваны ў апошні час, найбольш буйны накіраваны на развіццё біяэнергетыкі і стварэння ў Беларусі прамысловай вытворчасці новых відаў маторнага і кацельнага паліва. У прыватнасці, у 2008 годзе ў ТАА «ГроднаАзот» уведзена ў прамысловую эксплуатацыю вытворчасць сумесевага дызельнага біяпаліва, якое вырабляецца з рапсавага алею, магутнасцю 100 тысяч тон у год і вырабленна вытворчасці больш чым на 100 млрд рублёў. Сёлета арганізавана вытворчасць такога паліва ў ТАА «Магілёўхімвалакно». Да 2011 года плануецца давесці сумарны аб'ём дызельнага біяпаліва да двух млн тон у год і перавесці на гэта паліва ўвесь аўтамабільны парк краіны. Гэта дазволіць эканоміць каля 300 млн долараў штогод...

— Іншымі словамі, паступленне ў БДУ падобна на тое, як ты патрапіў бы ў кабіну машыніста лакамотыва, які вязе за сабой вялікі цягнік. Спачатку вучнем, а потым...

— Гэта сапраўды цікава і здорава.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПРЫЁМ У БДУ Ў 2009 Г.

У 2009 годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт плануецца прыняць 6460 студэнтаў (у 2008 г. было прынята 5998 студэнтаў).

План прыёму на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі складае 1995 месцаў (на 63 месцы больш, чым у 2008 годзе). Павелічэнне колькасці бюджэтных месцаў выклікана адкрыццём падрыхтоўкі па новых спецыяльнасцях, кірунках і спецыялізацыях, а менавіта: «фізіка з кірункам — ядзерная фізіка і тэхналогіі», «хімія са спецыялізацыямі — радыяцыйная хімія, радыяхімія», лагістыка». Павялічаны прыём на спецыяльнасці «прыкладная матэматыка», «эканамічная кібернетыка», «радыёфізіка», «фізічная электроніка», «камп'ютарная бяспека», «геаграфія», «геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў», «журналістыка (кірунак — друкаваныя СМІ)», «менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент)».

На завочную бюджэтную форму атрымання адукацыі план прыёму 425 чалавек. Упершыню будзе ажыццяўляцца прыём на спецыяльнасць «матэматыка са спецыялізацыяй WEB-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі)». Павялічаны план прыёму на спецыяльнасці «біялогія», «сацыяльная работа».

На дзённую платную форму атрымання адукацыі плануецца прыняць 2617 чалавек (у параўнанні з папярэднім годам павялічаны амаль на 200 чалавек).

На завочную платную форму атрымання адукацыі агульны план прыёму складзе 1423 чалавекі, у тым ліку для атрымання першай вышэйшай адукацыі 1125, а другой вышэйшай адукацыі — 298 чалавек.

Усяго ў БДУ на 16 факультэтах і ў 3 інстытутах будзе ажыццяўляцца прыём па 54 розных спецыяльнасцях:

Механіка-матэматычны факультэт
1. Матэматыка
2. Механіка

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі
1. Прыкладная матэматыка
2. Інфарматыка
3. Актуарная матэматыка
4. Эканамічная кібернетыка
5. Камп'ютарная бяспека

Факультэт радыёфізікі і электронікі
1. Радыёфізіка
2. Фізічная электроніка
3. Камп'ютарная бяспека

Фізічны факультэт
1. Фізіка

Хімічны факультэт
1. Хімія

Біялагічны факультэт
1. Біялогія
2. Біяэкалогія

Геаграфічны факультэт
1. Геаграфія
2. Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў
3. Геаэкалогія

Эканамічны факультэт
1. Эканамічная тэорыя
2. Эканоміка
3. Фінансы і крэдыт
4. Менеджмент

Факультэт журналістыкі
1. Журналістыка
2. Інфармацыя і камунікацыя
3. Міжнародная журналістыка
4. Літаратурная работа

Філалагічны факультэт
1. Беларуская філалогія
2. Славянская філалогія
3. Руская філалогія
4. Класічная філалогія
5. Рамана-германская філалогія
6. Усходняя філалогія

Гістарычны факультэт
1. Дакументазнаўства
2. Гісторыка-архівазнаўства
3. Гісторыя
4. Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук
1. Філасофія
2. Сацыялогія
3. Інфармацыя і камунікацыя
4. Псіхалогія

Факультэт міжнародных адносінаў
1. Лінгвакраіназнаўства
2. Міжнароднае права
3. Сусветная эканоміка
4. Менеджмент
5. Мытная справа
6. Міжнародныя адносіны

Юрыдычны факультэт
1. Правазнаўства
2. Эканамічнае права
3. Паліталогія

Гуманітарны факультэт
1. Культуралогія
2. Сучасныя замежныя мовы
3. Дызайн
4. Менеджмент
5. Сацыяльная работа
6. Інфарматыка

Ваенны факультэт
1. Псіхалогія
2. Хімія
3. Геаграфія
4. Правазнаўства
5. Журналістыка
6. Міжнародныя адносіны

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла
1. Тэалогія

Інстытут бізнэсу і менеджменту тэхналогій
1. Бізнэс-адміністраванне
2. Лагістыка
3. Кіраванне інавацыйнымі працэсамі

Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій
1. Дызайн
2. Менеджмент
3. Сацыяльная работа
4. Правазнаўства

УНП 100235722

НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ БУДУЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ

На сямнаццаці гектарах размясціўся студэнцкі гарадок Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Яе рэктар, доктар ветэрынарных навук, прафесар Антон Іванавіч Ятусевіч падкрэслівае, што ВНУ з'яўляецца адной з найстарэйшых у нашай краіне. Яе біяграфія пачалася ў 1924 годзе, і гэта ўстанова называлася «Беларускі дзяржаўны ветэрынарны інстытут, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі». У 2001 годзе ён быў перайменаваны ў вышэйназваную акадэмію, якой прысвоены статус вядучай навучальнай установы сельскай гаспадаркі краіны.

Студэнты-першакурснікі, якія навучаюцца па новай спецыяльнасці «ветэрынарная санітарыя і экспертыза».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Музей кафедры анатоміі жывёл ніколі не пустуе.

За час сваёй дзейнасці ў акадэміі вышэйшую адукацыю атрымалі і прайшлі перакваліфікацыю каля 40 тысяч спецыялістаў, і сёння ў ВНУ пяць факультэтаў: ветэрынарнай медыцыны, зааінжынерны, завочны, даінстытуцкай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Сёлета тут плануецца прыняць 365 студэнтаў на факультэт ветэрынарнай медыцыны і 100 — на зааінжынерны.

У суправаджэнні метадыста факультэта даінстытуцкай падрыхтоўкі Ігара Рыгоравіча Вараб'ёва мы наведалі вучэбныя аўдыторыі, лабараторыі, дзе праводзіліся лекцыі і практычныя заняткі, прайшлі па тэрыторыі студэнцкага гарадка, які патанае ў зеляніне і дзе (уявіце сабе) пасяліліся шматлікія птахі, у тым ліку і салаўі. Утульнасць тут адчуваецца ва ўсім і зручнасць — таксама. Вучэбныя корпусы, сем інтэрнатаў, Дом культуры, спартыўны комплекс, бібліятэка, сталовая — усё тут побач. Пераход з аўдыторыі ў аўдыторыю займае тры—чатыры хвіліны.

Звярнулі ўвагу і на тое, што акадэмія мае добрую вучэбна-матэрыяльную базу, дае грунтоўныя веды сваім выпускнікам, што, дарэчы, было адзначана і камісіяй Еўрасаюза. Нялішне будзе сказаць, што за апошнія пяць гадоў ВНУ атрымала самае сучаснае абсталяванне, неабходнае для навучальнага працэсу, расійскай, англійскай і нямецкай вытворчасці на суму ў сем мільярдаў рублёў, што тут адкрыты навукова-даследчы інстытут прыкладной ветэрынарнай медыцыны і біятэхналогіі, цэнтральная навукова-даследчая лабараторыя, якія акрэдытаваны па міжнародных стандартах. І што тут у адпаведнасці з патрабаваннямі часу ўводзяцца новыя вучэбныя дысцыпліны, спецкурсы і г.д.

Напрыклад, летась у акадэміі быў адкрыты прыём студэнтаў яшчэ па дзвюх спецыяльнасцях — ветэрынарнай санітарыі і экспертызе і ветэрынарнай фармацыі. Тыя, хто навучаецца або будзе навучацца па іх, у першым выпадку атрымаюць кваліфікацыю «ветэрынарна-санітарны ўрач», а ў другім — «правізар ветэрынарнай медыцыны».

Як патлумачыў нам Антон Іванавіч, ветэрынарна-санітарныя ўрачы павінны забяспечваць кантроль за якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў пры іх вытворчасці, захоўванні, экспарце і імпарце і нясуць адказнасць за санітарную ахову межаў рэспублікі. Месцам іх працы з'яўляюцца прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці, санітарныя бойні, ветэрынарныя санітарныя ўтылізацыйныя заводы, лабараторыі дзяржаўнай ветэрынарнай санітарнай экспертызы на рынках, ветэрынарны нагляд на мяжы і транспарце, навукова-даследчыя ўстановы і г. д.

Адкрыццё спецыяльнасці «Правізар ветэрынарнай медыцыны» ўзнікла ў сувязі з пашырэннем вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў і сродкаў для лячэння і прафілактыкі хваробаў жывёлы ў краіне. Бо сучасны ўзровень развіцця ветэрынарнай медыцыны не можа быць інтэнсіўным без прымянення эфектыўна дзейных лекавых прэпаратаў.

Запатрабаванасць у ветэрынарных фармацэўтах відавочная. Яна абумоўлена недахопам кваліфікаваных спецыялістаў-правізараў у ветэрынарных аптэках, навучальных і навуковых установах, ветэрынарных клініках, фармацэўтычных прадпрыемствах. У нашай рэспубліцы сёння існуе значная колькасць прадпрыемстваў як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці, якія займаюцца выпускам лекавых прэпаратаў, а таксама арганізацыі, што рэалізуюць і прымяняюць іх. Сярод іх — Віцебская біяфабрыка, чатыры заводы ветэрынарных прэпаратаў, 28 вытворчых камерцыйных прадпрыемстваў, 118 аптэк раённых ветстанцый па барацьбе з хваробамі жывёлы, 24 зааветснабы, прыватныя ветэрынарныя аптэкі і шырокая сетка крамаў па рэалізацыі ветпрэпаратаў.

Усё пералічанае вышэй гаворыць за тое, што ў любой эканамічнай сітуацыі гэтыя прафесіі будуць запатрабаванымі і прэстыжнымі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Як вяскоўцу стаць абітурыентам?

Пыталіся? Адказваем...

— Патлумачце, калі ласка, ці можа жыхар сельскай мясцовасці пры падачы дакументаў у ВНУ выбіраць паміж школьным атэстатам і дыпломам каледжа? Сярэдні бал школьнага атэстата больш высокі, да таго ж адукацыя, атрыманая ў сельскай школе, дае магчымасць быць аднесеным да катэгорыі абітурыентаў з сельскай мясцовасці і паступаць па асобным конкурсе...

— Калі абітурыент збіраецца паступаць у ВНУ на дзённую форму навучання, то ён можа скарыстацца дакументам аб заканчэнні сельскай агульнаадукацыйнай школы. Праўда, да школьнага атэстата трэба будзе абавязкова дадаць даведку аб тым, што абітурыент пражываў у сельскай мясцовасці не менш як два гады на момант атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. А калі ж малады чалавек плануе паступаць у ВНУ на завочнае навучанне па профілю сваёй спецыяльнасці, атрыманай у каледжы, то ў гэтым выпадку яму давядзецца падаць у прыёмную камісію дыплом аб заканчэнні каледжа, які дасць яму магчымасць прэтэндаваць на бюджэтнае навучанне. Але ў гэтым выпадку вы будзеце лічыцца ўжо гарадскім абітурыентам і не зможаце ўдзельнічаць у асобным конкурсе для сельскай моладзі. Хоць, як сведчыць практыка апошніх гадоў, усё часцей і гараджане, і выпускнікі сельскіх навучальных устаноў паступаюць па агульным конкурсе, таму што сярэдні бал сельскай моладзі аказваецца не ніжэйшы, а нават вышэйшы за сярэдні бал выпускнікоў гарадскіх навучальных устаноў. Летась, у 33 ВНУ пры залічэнні на кожную другую спецыяльнасць (у 50 працэнтах выпадкаў) прахадныя балы выпускнікоў сельскіх устаноў адукацыі былі роўныя ці перавышалі балы абітурыентаў-гараджан.

— Скажыце, якімі правіламі правапісу і арфаграфіі трэба карыстацца на цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове?

— У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў запэўніваюць, што тэсты, якія будуць прапанаваныя ўдзельнікам ЦТ 2009 года, складзены па дзейных на сёння правілах беларускай мовы. Таму абітурыентам лепш не арыентавацца на старонках друкаваных выданняў новыя арфаграфічныя нормы.

— Мой сын стаў пераможцам заключнага тура рэспубліканскай алімпіяды па хіміі. Але школу ён заканчвае толькі ў наступным годзе. Ці зможа ён скарыстацца сваёй перамогай у 2010 годзе?

— Не зможа, таму што льготы прадугледжаны толькі для пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, праведзеных у гэтым годзе.

— Я планую атрымаць другую вышэйшую адукацыю і паступіць на першы курс. Ці ёсць у мяне нейкія перавагі перад іншымі абітурыентамі?

— Калі вы прэтэндуеце на бюджэтнае навучанне (гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі першую вышэйшую адукацыю вы атрымлівалі на платнай аснове), то ўдзельнічаеце ў агульным конкурсе і паступаеце на агульных умовах. А калі вы паступаеце на платнае навучанне, то маеце права на пазаконкурснае залічэнне.

— У БНТУ на прыборабудаўнічым факультэце ёсць спецыяльнасць «спартыўная інжынерыя». Патлумачце, калі ласка, дзе ў нашай краіне могуць быць запатрабаваныя такія спецыялісты?

— На спецыяльнасці «спартыўная інжынерыя» рыхтуюць інжынераў для спартыўных аб'ектаў: фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў і комплексаў, для ААТ «Мотавела», спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» і іншых. Хтосьці ж павінен займацца эксплуатацыяй суперсучасных спартыўных аб'ектаў і складанага тэхнічнага абсталявання, прызначанага для патрэб сучаснага спорту і трэніровачнага працэсу... Прычым кваліфікацыя маладых спецыялістаў дазваляе ім працаваць адначасова ў якасці інжынера і інструктара. Студэнты вывучаюць механіку, электроніку, канструяванне, праграмаванне плюс нетыповыя для тэхнічных ВНУ дысцыпліны (анатомію, фізіялогію), каб правільна выкарыстоўваць у сваёй рабоце спартыўнае абсталяванне ці, напрыклад, распрацаваць свой уласны спартыўны трэнажор, якіх у Беларусі пакуль практычна не вырабляецца.

— Калі я планую паступаць у расійскую ВНУ, ці трэба мне здаваць адзіны дзяржаўны экзамен?

— Не трэба. Замежным і расійскім грамадзянам, якія атрымлівалі агульную сярэдняю адукацыю ў замежных установах адукацыі, дадзена права паступаць на падставе ўступных іспытаў, арганізаваных непасрэдна ў вышэйшай навучальнай установе.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Гродзенскі дзяржуніверсітэт пачне падрыхтоўку педагогаў дашкольных устаноў на стацыянары

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы ў новым навучальным годзе адкрывае на стацыянары падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «дашкольная адукацыя». Аб гэтым паведаміў журналістам дэкан педагагічнага факультэта ГрДУ Віктар ТАРАНЦЕЙ.

Планам набору на бюджэтную форму навучання прадугледжваецца ўвядзенне 17 месцаў для гэтай спецыяльнасці. Тэрмін навучання — 4 гады. Да гэтага часу на факультэце падрыхтоўка кадраў з вышэйшай адукацыяй для дашкольных устаноў праводзілася толькі завочна. Пры гэтым выпускнікі педагагічных каледжаў, з якімі ўніверсітэт мае адпаведныя дагаворы, навучаюцца 3 гады.

«Сама рэчаіснасць падштурхоўвае нас да неабходнасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных педагогаў для дашкольных устаноў, — адзначыў дэкан. — Сёння дзеці з лёгкасцю разбіраюцца ў функцыях мабільных тэлефонаў, працуюць на камп'ютары, дэманструюць схільнасць да вывучэння моў. Такім чынам, інтэлектуальны патэнцыял сучаснага дзіцяці прад'яўляе павышаныя патрабаванні да педагагічнага майстэрства выхавальніка». Да таго ж менавіта дзетсадаўскі ўзрост — час, калі неабходна паспець закласці асновы ў развіцці творчай актыўнасці дзіцяці. «І гэты час нельга ўпусціць», — падкрэсліў Віктар Таранцей.

Паводле яго слоў, на факультэце ёсць спецыялісты, якія займаюцца распрацоўкай методык аздараўлення дашкалят, фарміравання іх творчай актыўнасці, развіваюць такі напрамак, як педагогіка даверу, у рамках якога распрацоўваюцца тэхналогіі ўстанаўлення эмацыянальнага кантакту паміж педагогам і дзіцем. «Мы плануем у бліжэйшыя гады, калі пачатыя кандыдацкія работы будуць завершаны, і дысертанты атрымаюць навуковыя ступені кандыдатаў, адкрыць на факультэце кафедру даш

Рынак працы

ВУЧЫЦЦА. ТОЛЬКІ ПОТЫМ — ЗАРАБЛЯЦЬ

Нягледзячы на скарачэнне колькасці вакансій, магчымасцяў для працаўладкавання застаецца па-ранейшаму шмат. Заяўкі ад наймальнікаў ёсць і да таго ж — самага рознага плана. Разам з тым, таксама не сакрэт: знайсці сабе па-сапраўднаму добрае месца заўсёды цяжка. А зрабіць гэта чалавеку без спецыяльнасці і ўвогуле нерэальна.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

БЫЛЫ ЮРЫСТ. І ГАСТАРБАЙТАР

Падрыхтоўка спецыялістаў для будаўнічай галіны і майстроў вытворчага навучання для іншых устаноў адукацыі — асноўныя напрамкі мінскага Індустрыяльна-педагагічнага каледжа вось ужо даволі працяглы час. Але сам каледж вядомы не толькі гэтым. Сёння на яго базе працуе Рэсурсны цэнтр навучання будаўнічым тэхналогіям, прычым не ў апошнюю чаргу цэнтр разлічаны... на беспрацоўных. Штогод па накіраванні службы занятасці тут набываюць спецыяльнасць па 500-600 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны. Хтосьці з іх толькі летась закончыў школу, іншым засталося няшмат да пенсіі, але большасць — людзі зусім маладыя, сярэдні ўзрост навучэнцаў складае каля 30 гадоў.

— Прычыны, па якіх трапляюць сюды, самыя розныя, — заўважае начальнік цэнтра Валерый Сураўцаў. — Адны проста не здолелі нікуды паступіць пасля школы, другія папрацавалі дворнікамі, грузчыкамі ці прыбіральшчыкамі і вырашылі змяніць некваліфікаваны занятак, трэція атрымалі адукацыю юрыстаў ці эканамістаў і не змаглі знайсці працоўнае месца, чацвёртыя вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі і распачынаюць новае жыццё, пятыя маюць намер проста павысіць уласны разрад. У рэшце рэшт, апошнім часам стала прыходзіць усё больш «гастарбайтараў». Інакш кажучы, людзей, якія ў свой час лічылі за лепшае з'ездзіць без якой-небудзь спецыяльнасці на расійскія будоўлі, працавалі там прагінаючыся, але цяпер, у сувязі з крызісам, вярнуліся дадому. І з-за адсутнасці дакументаў аб адукацыі не могуць уладкавацца ў Беларусі.

Ці не галоўны «плюс» цэнтра — навучанне па накіраванні цэнтра занятасці для беспрацоўнага цалкам бясплатнае. І да таго ж абмежаванае па часе: для атрымання дзяржаўнага пасведчання спатрэбіцца ўсяго ад 4 да 6 месяцаў. Прычым заняткі не абмяжоўваюцца тэорыяй, паралельна кожны праходзіць практыку ў арганізацыях сталіцы — «зарабляе» патрэбны любому наймальніку вопыт.

— Што да спецыяльнасцяў, то мы ўважліва вывучаем рынак, кантактуем з будаўнічымі арганізацыямі, ацэньваем попыт, — працягвае Валерый Сураўцаў. — А адсюль і варыянты: беспрацоўныя могуць вучыцца на маляра-тынкоўшчыка, абліцоўшчыка-плітачніка, электрагазазваршчыка, муляра, печніка, цесляра-станочніка, слесара-сантэхніка, мантажніка санітарна-тэхнічных сістэм і абсталявання, а надалей з'явіцца магчымасць асвоіць працу страхара.

Да слова, самі заняткі ідуць на самым сучасным абсталяванні і з выкарыстаннем найноўшых матэрыялаў, скажам, вадкіх шпалераў ці венецыянскай плітачкі. Так, гэта адбіваецца на выдатках на навучанне — у залежнасці ад спецыяльнасці яны складаюць 150-200 тысяч рублёў на чалавека ў месяц. Але адначасова ёсць і вынік: большасць выпускнікоў адразу ж знаходзяць працу — будаўнічыя арганізацыі даюць заяўкі ці ўвогуле прапануюць месца пасля праходжання практыкі. Пры гэтым многія з іншагародніх навучэнцаў застаюцца ў сталіцы, а некаторыя — і атрымліваюць інтэрнат.

— Безумоўна, лепш, калі б працаўладкоўваліся ўсе без выключэння, — зазначае Валерый Сураўцаў. — Аднак, пэўна, так не будзе ніколі: чалавек заўсёды шукае большую зарплату, лепшыя ўмовы працы, а значыць, выбірае работу сам. Ды і, па вялікім рахунку, не так істотна, аддасць ён перавагу дзяржаўнай арганізацыі ці прыватнай фірме. Больш важна, што ён можа рабіць такі выбар. Бо мае спецыяльнасць.

КАЛІ РАПТАМ НЕ АДРАЗУ...

Статыстыка сведчыць: паказчыкі навучання і перанавучання ўзрастаюць штогод. Пры гэтым больш чым палова навучэнцаў разам з пасведчаннем аб спецыяльнасці сапраўды атрымлівае працоўнае месца. Які лёс усіх астатніх?

— Ва ўмовах канкурэнцыі найбольш імкнецца выбіраць самых лепшых, і з работнікамі, якія маюць больш высокую кваліфікацыю, ніякіх цяжкасцяў няма, — адзначае начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай Коханаў. — Разам з тым, сцвярджаць, што ўсе астатнія навучаліся дарэмна, нельга. Чалавек без спецыяльнасці — патэнцыяльны беспрацоўны на ўсё жыццё, але па вялікім рахунку сама па сабе спецыяльнасць — толькі першы крок да кар'еры. Апроч яе, адыгрывае значную ролю практыка, і часта пытанні ўзнікаюць менавіта з ёй. Але падобная праблема — таксама вырашальная.

На выпадак, калі перашкодай для ўладкавання становяцца недастатковая кваліфікацыя і адсутнасць практыкі, ёсць магчымасць даць накіраванне на моладзевую практыку. Калі ж не спрацуе і гэта, пачынае дзейнічаць механізм браніравання працоўных месцаў, і ў тым ліку — для асобаў ва ўзросце да 21 года. Такім чынам, сітуацыя выпраўляецца. Летась прафесійнае навучанне і перанавучанне праз службы занятасці прайшлі 22,3 тысячы грамадзян краіны. Зноў жа, потым ці не кожны другі з іх апынуўся на ўліку як беспрацоўны. Аднак, дзякуючы моладзевай практыцы і броні, па выніках года не змаглі ўладкавацца... толькі 1,4 тысячы чалавек.

Між тым сёлета, калі павялічыцца выпуск школьнікаў, навучанне па накіраваннях службаў занятасці стане актуальным удвая. У ВНУ, тэхнікумы, каледжы і ПТВ патрапяць далёка не ўсе. Таму, паводле слоў Мікалая Коханава, цяпер удакладняецца попыт на рынку працы. Стаўка па-ранейшаму будзе рабіцца на падрыхтоўку па найбольш запатрабаваных рабочых спецыяльнасцях — вадзіцеля аўтамабіля, слесара, муляра, цесляра, тынкоўшчыка, электрагазазваршчыка, механізатара, швачкі. Прычым сама па сабе праграма навучання і перанавучання разлічана не толькі на выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў, а паралельна — і на грамадзян краіны больш «дарослага» ўзросту.

ПРАБЛЕМА — У АДСУТНАСЦІ ЖАДАННЯ

Па сутнасці шанц прайсці навучанне ці перанавучанне па накіраванні службы занятасці маюць усе, хто не дасягнуў пенсійнага ўзросту. Праблема ў іншым — адсутнасці жадання. Часам нават даходзіць да абсурдных сітуацый. У невялікім горадзе, дзе традыцыйна адчуваліся складанасці з уладкаваннем жанчын, з'яўляецца новая вытворчасць. Мэтава для прадстаўніц «слабай палавіны» ствараюцца працоўныя месцы, па іх прапануецца не самая маленькая зарплата. І раптам высвятляецца: гэта амаль нікому не патрэбна. Бо для атрымання вакансіі неабходна асвоіць іншую спецыяльнасць. А рабіць гэта ніхто з беспрацоўных не хоча — папулярнасцю карыстаюцца выключна некваліфікаваныя і малааплатныя пасады прыбіральшчыцы ці гардэробшчыцы.

— Сталы чалавек наўрад ці будзе паступаць у тэхнікум ці ПТВ, не кожны наважыцца і на курсы, — канстатуе Мікалай Коханаў. — І якраз у сувязі з гэтым выпадае ўзгадаць пра яшчэ адну праблему — арганізацыю навучання і перападрыхтоўкі непасрэдна на вытворчасці. З пункту гледжання псіхалогіі беспрацоўных такі варыянт быў бы больш прывабным. Аднак, нягледзячы на заканадаўчую базу і пэўныя стымулы, цікавасць да яго з боку наймальнікаў застаецца мізэрнай. І зразумець падобную пазіцыю цяжка. Так, сёння мы сутыкаемся з прастоямі і практыкай вымушаных водпускаў. Але ў той жа час не спыняюцца інвестыцыі, купляецца новае абсталяванне, прыходзяць сучасныя тэхналогіі — адпаведна, патрабуюцца кадры. І рыхтаваць іх трэба сёння. Інакш заўтра, калі эканамічныя цяжкасці застануцца ў мінулым, нашым суб'ектам гаспадарання застанецца адно — запрашаць работнікаў з-за мяжы.

Сяргей ГРЫБ.

1,4 ТЫСЯЧЫ ДЗЯЦЕЙ — У НЯПОЎНАГАДОВЫХ МАЦІ

У Беларусі летась няпоўнагадовыя маці нарадзілі 1 тыс. 383 дзіцяці, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Так, 14 немаўлят з'явіліся ў 14-гадовых маці, 98 маленькіх — у 15-гадовых. 16-гадовыя маці нарадзілі на свет 327 дачок і сыноў (прычым у 12 юных маці гэта былі ўжо другія роды). Спецыялісты розных ведамстваў — сацабароны, аховы здароўя, адукацыі — сходзяцца ў думцы, што нараджэнне дзяцей у маці, якія не дасягнулі паўналецця, — сур'ёзная сацыяльная праблема, бо дзецям патрэбна забяспечыць годнае выхаванне і паўнацэннае развіццё, зусім не кожная юная маці здольная нават самастойна даглядаць дзіця. Варта таксама мець на ўвазе, што нараджэнне дзяцей да наступлення біялагічнай і сацыяльнай сталасці мае вялікую рызыку для здароўя і самой юнай жанчыны, і для яе дзіцяці.

Кар. БЕЛТА.

Інфармацыя аб рэспубліканскім конкурсе для прызначэння стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2010 год

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 № 367 «Аб удасканаленні стымулявання творчай працы маладых вучоных» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 127, 1/6693; 2006 г., № 56, 1/7416; 2009 г. № 1/10683) заснаваныя 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук (далей — стыпендыі). Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год у памеры, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на падставе прапаноў спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.

1. Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры тых, хто дасягнуў найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці, дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук — да 35 гадоў, вучоных без ступені — да 30 гадоў на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне.

2. Пры вылучэнні кандыдатур таленавітых маладых вучоных для ўдзелу ў конкурсе ўлічваюцца іх дасягненні ў прыярытэтных кірунках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічнай дзейнасці, уклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Вынікі даследаванняў вучоных павінны адпавядаць наступным крытэрыям (аднаму або некалькім):

адкрыццё раней невядомых заканамернасцяў, атрыманне прынцыпова новых навуковых вынікаў, распрацоўка новых навуковых тэорый і канцэпцый, якія атрымалі практычнае пацвярджэнне і (або) прызнанне ў Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

распрацоўка новых спосабаў, прыладаў, рэчываў, штамаў мікраарганізмаў, культур клетак раслін і жывёл, карэннае іх удасканаленне або прымяненне па новым прызначэнні (пацвярджаецца патэнтамі на вынаходніцтва) і іх укараненне ў практыку;

стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі (спосабаў, прыладаў, тэхналагічных працэсаў), якія па большасці тэхнічных параметраў адпавядаюць сусветнаму ўзроўню або перавышаюць яго (пацвярджаецца патэнтамі на вынаходніцтва), і іх укараненне ў практыку.

Названыя крытэрыі ўлічваюцца ў дачыненні да таленавітых маладых вучоных наступным чынам:

дасягненні дактароў навук павінны ўключаць поўны цыкл работ — ад навуковай ідэі да практычнай рэалізацыі і (або) прызнання вынікаў даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

дасягненні кандыдатаў навук павінны мець важнае навуковае і прыкладное значэнне — практычнае пацвярджэнне і (або) прызнанне вынікаў даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь і (або) за мяжой;

дасягненні маладых вучоных без ступені павінны выражацца ва ўдзеле ў распрацоўцы ідэі, якая мае важнае навуковае і (або) практычнае значэнне, у правядзенні фундаментальных і (або) прыкладных даследаванняў, накіраваных на яе пацвярджэнне і (або) практычную рэалізацыю.

3. Вылучэнне кандыдатур ажыццяўляецца арганізацыямі па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага, на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацый калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе. Пры вылучэнні кандыдатур улічваюцца водзывы не менш чым двух незалежных экспертаў, якія залучаюцца гэтай арганізацыяй.

У водзыве незалежнага эксперта павінна быць адлюстравана:

актуальнасць тэмы навуковых даследаванняў і яе адпаведнасць прыярытэтным кірункам фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічнай дзейнасці;

атрыманыя вынікі і іх практычная значнасць;

укараненне атрыманых вынікаў з указаннем эканамічнага эфекту (пры наяўнасці);

адпавednасць атрыманых вынікаў крытэрыям, вызначаным для дасягненняў маладых таленавітых вучоных гэтай намінацыі;

колькасць публікацый (артыкулы ў замежных выданнях, артыкулы ў рэспубліканскіх выданнях, якія рэцэнзуюцца, манаграфіі і іншыя выданні, патэнты, аўтарскія пасведчанні, рацпрапановы);

удзел у міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях;

матываванае абгрунтаванне прызначэння стыпендыі ў выглядзе фармулёўкі.

Рашэнне сходу навуковых работнікаў, пасяджэнні навукова-тэхнічнага (вучонага) савета з'яўляецца сапраўдным, калі ў галасаванні ўдзельнічала не менш за 2/3 навуковых работнікаў або членаў навукова-тэхнічнага (вучонага) савета. Рэкамендаванымі лічацца кандыдатуры, якія атрымалі больш за 2/3 галасоў навуковых работнікаў або членаў навукова-тэхнічнага (вучонага) савета, якія ўдзельнічалі ў галасаванні.

4. Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, падаюць па кожнай з іх хадайніцтвы, да якіх дадаюцца наступныя дакументы:

выпіска з пратакола сходу навуковых работнікаў або пасяджэння навукова-тэхнічнага (вучонага) савета арганізацыі аб вылучэнні кандыдатуры для прызначэння стыпендыі з указаннем вынікаў галасавання, матываваным абгрунтаваннем дасягненняў таленавітага маладога вучонага ў выглядзе фармулёўкі, за што рэкамендуецца прызначыць стыпендыю ў строгай адпаведнасці з крытэрыямі, названымі ў частках 2, 3, 4 пункта 2 (пададзеная фармулёўка з'яўляецца абгрунтаваннем для прызначэння стыпендыі і ў працэсе разгляду ў яе можна ўносіць толькі рэдакцыйныя праўкі);[1]

справаздача аб навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці таленавітага маладога вучонага, зацверджаная кіраўніком арганізацыі па месцы яго асноўнай працы;

водзывы двух незалежных экспертаў;

спіс апублікаваных кніжных выданняў, навуковых артыкулаў, патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў таленавітага маладога вучонага (копіі патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў дадаюцца) за апошнія тры гады, падпісаны гэтым вучоным і засведчаны кіраўніком арганізацыі;

дакументы, якія пацвярджаюць укараненне навуковых вынікаў у розныя галіны эканомікі, іншыя сферы дзейнасці і сведчаць аб асабістым укладзе таленавітага маладога вучонага (даведкі і (або) акты аб укараненні вынікаў даследаванняў);

звесткі аб таленавітым маладым вучоным; яго прозвішча, імя, імя па бацьку, дзень, месяц, год нараджэння і месца нараджэння (з дадаваннем ксеракопій старонак пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, якія змяшчаюць анкетныя звесткі пра маладога вучонага), адукацыя (якую ўстанову, што забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі, закончыў і калі), спецыяльнасць па адукацыі; вучоная ступень і вучонае званне; месца працы (назва арганізацыі і яе месцазнаходжанне ў адпаведнасці з установчымі дакументамі, службовы тэлефон); займаемая пасада (з указаннем года на яе прызначэнне); знаходжанне за мяжой (краіна, перыяд знаходжання); узнагароды (з указаннем даты ўзнагароджання), звесткі аб раней прызначаных стыпендыях маладому вучонаму; праца ў мінулым (перыяд, пасада, месца працы); асноўныя кірункі навуковай дзейнасці, кіраўніцтва аспірантамі і сушукальнікамі; хатні адрас (з указаннем паштовага індэкса) і тэлефон (з указаннем кода горада);

службовая характарыстыка.

Усе дакументы афармляюцца ў вызначаным парадку і падаюцца ў адным экзэмпляры ў асобным скорасшывальніку.

Арганізацыі таксама падаюць спіс рэкамендаваных кандыдатур (і яго электронную версію), падпісаны кіраўніком арганізацыі і афармлены згодна з Дадаткам (размешчана на афіцыйным сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — http://gknt.org.by).

5. Дакументы на конкурс для назначэння стыпендый на 2010 год падаюцца да 1 ліпеня 2009 года ў:

Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі, на адрас: 220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Тэлефоны для даведак: (017) 284 11 63, 284 24 56;

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, на адрас: 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 200 52 01;

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі, на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 294 92 70.

У выпадку парушэння тэрміну і формы падачы названых дакументаў або падачы іх не ў поўным аб'ёме хадайніцтва арганізацый, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, да разгляду не прымаюцца!

Заўвага: стыпендыі не прызначаюцца маладым вучоным, якім у папярэднія пяць гадоў (уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне) прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, а таксама на гэты год устанаўліваюцца персанальныя надбаўкі ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2004 № 571 «Аб удасканаленні стымулявання працы ў сферы аховы здароўя, навукі, культуры і адукацыі, унясенні змяненняў і прызнанні страціўшымі сілу некаторых указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 188, 1/6033).

[1] З узорамі фармулёвак можна азнаёміцца на афіцыйным сайце ДКНТ — http://gknt.org.by

Погляд

ЯКІ «ІНТЫМ» ШУКАЎ І ЗНАЙШОЎ ТЭАТР У «ДЗЁННІКУ» МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Не на жарт была здзіўлена, калі даведалася, што ў рэпертуары Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі з'явіўся спектакль, прысвечаны «інтымнаму дзённіку» Максіма Багдановіча.

Якая смелая навацыя!?. Якая геройская разняволенасць!?.

Тэатрам не пастаўлена ніводнага спектакля, прысвечанага Паэту: яго лёсу, шуканням, роздумам і вершам, яго шляху да Беларусі і да сябе самога...

А тут — на табе! — адразу спектакль «пра гэта».

***

... Што гэта было?

Цынічная спекуляцыя на імені Максіма Багдановіча — інакш і не скажаш.

Да прапанаванага сцэнічнага відовішча паэт не мае дачынення. Дарэчы, паэзіяй у спектаклі ўвогуле не пахне. Ну, навошта заглыбляцца ў неістотныя драбніцы — мабыць, менавіта так вырашылі ў тэатры. І спрацавалі па прынцыпе: ускалмаціць другараднае і «замаўчаць» галоўнае, вызначальнае.

Якая смелая навацыя!?. Якая геройская разняволенасць!?.

***

...Замест паэзіі Багдановіча тэатр выплюхвае ў глядзельную залу фізіялагічныя дэталі і падрабязнасці... палавога акту. І канкрэтна: што адбываецца ў гэты пікантны момант з інтымным органам мужчыны і, адпаведна, — жанчыны. Мабыць, цытаты з медыцынскіх падручнікаў?..

Якая смелая навацыя!?. Якая геройская разняволенасць!?.

Толькі вось чамусьці ў рэпертуарнай афішы не пазначана «для дарослых». Ці можа, менавіта так тэатр увасабляе асветніцка-выхаваўчую функцыю?

(Крута!.. Ж-жэсць!.. — папулярныя падлеткавыя вызначэнні ў гэтым выпадку цалкам дарэчы).

Як ні прыкра пра гэта гаварыць, але не праходзіла адчуванне, што знаходжуся не ў прафесійным тэатры, а на канцэрце прымітыўнай самадзейнасці.

Якая смелая навацыя!?. Якая геройская разняволенасць!?.

***

«Усё спаганяць людзі...»

Гэтыя сакраментальныя словы Янкі Купалы шмат разоў узгадваліся падчас спектакля.

Асобныя творчыя знаходкі проста згубіліся ў акіяне пошласці і бездані крыўляння. Тэатр, пэўна, лічыць гледачоў разумова непаўнацэннымі істотамі?..

Акцёр, які іграе паэта, вельмі прагне быць падобным на феерычнага купалаўца Віктара Манаева, таму і стараецца паўтарыць-скапіраваць-змітаваць «фірменныя» манаеўскія жэсты. А ў выніку...

Ці варта, даражэнькія-родненькія, блытаць божы дар з яечняй?

Максім Багдановіч з тэатральнай сцэны ўвогуле паўстае... нейкім шалёным чалавекам. Міжволі ўзнікае думка: калі гэты мужчына і хворы — дык не на сухоты, а «на галаву».

Якая смелая навацыя!?. Якая геройская разняволенасць!?.

***

Яшчэ ў 1912 годзе Максім Багдановіч пісаў:

Чаму у нас акамянеласці
«Духоўнай страваю» завуць?
Іх ужываць — не хопіць смеласці!
Ў музеум іх няхай нясуць!

***

Адзін з асноўных пастановачных прынцыпаў — поўзанне «дзейных асобаў» па падлозе. Тонкі намёк на пошукі інтыму?.. І не толькі намёк. Акцёрскія абдымкі былі ў цэлым досыць пераканаўчымі. Пагладжванне-абмацванне пэўных частак цела, тое-сёе... Перашкаджала хіба што вопратка. А так — якая смелая навацыя, якая геройская разняволенасць!?.

Помніцца, у так званую эпоху галоснасці Рускі тэатр паставіў спектакль паводле «Мастера и Маргариты» Булгакава. Там таксама выкарыстоўваўся небанальны пастановачны прыём: у адной са сцэн актрыса-Маргарыта з'яўлялася аголенай. Публіка валам валіла ў тэатр паглядзець «на голую Маргарыту». І напагатове былі біноклі і біноклікі самых розных «калібраў»...

***

Замест сумнеўнага «інтымнага відовішча» лепш прачыталі б са сцэны вершы Максіма.

Маладыя гады,
Маладыя жаданні!
Ні жуды, ні нуды,
Толькі шчасце кахання.

Помніш толькі красу,
Мілы тварык дзявочы,
Залатую касу,
Сіняватыя вочы.

Цёмны сад — вінаград,
Цвет бяленькі вішнёвы, —
І агністы пагляд,
І гарачыя словы.

Будзь жа, век малады,
Поўны светлымі днямі!
Пралятайце, гады,
Залатымі агнямі!

1915-1916

Ёсць любоў на свеце, здрада і расстанне;
Шмат яшчэ чаго нам прыйдзецца зазнаці...
Ўсё мацней пяю я аб чыімсь каханні,
І тугі у спеве болей не схаваці.

1915-1916

***

... Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што калісьці мочаныя яблыкі прадавалі самі тэатры — побач з білетнай касай. А што: дадатковы пункт даходу, дый пэўная сатысфакцыя гледачам за дарэмна патрачаныя грошы...

Апошнім часам у моду ўвайшло кіданне чаравікаў. Мае засталіся пры мне — хоць і мільгала думка шпурнуць іх на сцэну. Як сведчанне адносінаў да паказанага.

Пагадзіцеся: якая смелая была б навацыя, геройская разняволенасць!..

***

У 1974 годзе Андрэй Вазнясенскі напісаў верш «Порнография духа» — пра цынізм, адсутнасць сораму, здзек над мараллю.

Отплясывает при народе
с поклонником голым подруга.
Ликуй, порнография плоти!
Но есть порнография духа...

Парнаграфія духу — ці не самы цяжкі грэх нашага часу?..

Таццяна ПАДАЛЯК.

Шанцы застацца беспрацоўнымі ў рабочых — мінімальныя

Прафесійны выбар

Два апошнія гады месцы ў многіх сталічных прафесійна-тэхнічных навучальных установах запаўняліся даволі складана. Адна з прычын — дэмаграфічны спад. Другая — скіраванасць моладзі на атрыманне вышэйшай адукацыі. Летась, напрыклад, 74,4 працэнта выпускнікоў сталічных школ працягнулі навучанне ў ВНУ. Да таго ж адыграла сваю ролю і вяртанне школы да 11-годкі, дзякуючы якому ў выпускнікоў базавай школы з'явілася магчымасць усяго праз год атрымаць атэстат аб сярэдняй адукацыі. Аднак, нягледзячы на падаўжэнне тэрмінаў прыёму дакументаў да 15 верасня, сталічныя прафтэхустановы змаглі ўкамплектавацца ўсё адно толькі на 92,3 працэнта ад запланаванага. Да таго ж сістэма сталічнай прафтэхадукацыі прыняла на навучанне дастаткова вялікую колькасць іншагародніх навучэнцаў — 2459 чалавек, што складае больш як 36 працэнтаў ад агульнай колькасці залічаных.

Затое сёлета на выхадзе з базавай школы чакаецца рэкордная колькасць выпускнікоў: у Мінску іх будзе ў 2,8 раза больш, чым у папярэднім годзе. Такі «падарунак» сістэме прафтэхадукацыі зрабіў зноў-такі пераход школы на 11-гадовы тэрмін навучання. Павялічваецца, хоць і нязначна, таксама і колькасць выпускнікоў старшай ступені агульнаадукацыйнай школы. Але ці гатовыя прафтэхустановы прыняць усіх ахвотных атрымаць рабочую прафесію?

— План прыёму ў прафтэхустановы будзе павялічаны сёлета па краіне на 26,6 працэнта, або на 12,5 тысячы чалавек, — паведаміў **намеснік міністра адукацыі Барыс ІВАНОЎ**. — Мяркуецца, што на базе агульнай сярэдняй адукацыі набор павялічыцца на 2,5 тысячы чалавек, і на 10 тысяч — на аснове базавай адукацыі. Як запаўнівае Барыс Іваноў, перш чым выйсці на агучаныя лічбы, быў праведзены маніторынг у рэгіёнах: вывучаліся патрэбы рынку працы, збіраліся заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў, праводзілася прафарыентацыйная работа сярод выпускнікоў. Паколькі дзяржава гарантуе кожнаму выпускніку першае працоўнае месца, падрыхтоўка рабочых мае цалкам адрасны характар і ажыццяўляецца па дагаворах з арганізацыямі-заказчыкамі. Трэба было ўлічваць і магчымасці мясцовых бюджэтаў, з якіх фінансуецца пераважная большасць прафтэхустаноў, а таксама «фізічныя» і «педагагічныя» магчымасці навучальных устаноў. На шчасце, нашы прафтэхустановы, якія будаваліся яшчэ за савецкім часам, былі разлічаны на навучанне 140 тысяч навучэнцаў, а да апошняга часу колькасць навучэнцаў была ў межах 100 тысяч чалавек. Так што рэзервы для павелічэння прыёму былі...

Па словах Барыса Іванова, на некаторыя рабочыя прафесіі попыт з боку моладзі значна перавышае колькасць выдзеленых месцаў. Так, традыцыйна **не адчуваюць дэфіцыту ў абітурыентах прафесійна-тэхнічныя ўстановы сферы абслугоўвання, чыгуначнага транспарту, электронікі, гандлю, кулінарыі, паліграфіі,** а на некаторых спецыяльнасцях, такіх як «аператар сувязі», «кантралёр аддзялення банка», «цырульнік», «аператар электроннага набору і вёрсткі», «сакратар-машыністка», «страхавы агент» нават фарміруюцца конкурсы — да трох-чатырох чалавек на месца. Устойлівым попытам у моладзі кожны год карыстаюцца такія прафесіі, як «памочнік машыніста цеплавоза і электравоза», «праваднік пасажырскага вагона», «білетны касір», «слесар па рамонце аўтамабіляў», «вадзіцель катэгорыі С», «афіцыянт», «бармэн».

Між іншым, самымі вострадэфіцытнымі для Мінска з'яўляюцца на сёння спецыялісты будаўнічага профілю, што звязана з пастаянным ростам аб'ёмаў будаўніцтва ў сталіцы жылля, сацыяльных і спартыўных аб'ектаў: каменшчыкі, муляры, майстры апрацоўчых работ, тынкоўшчыкі. Калі ў 2006 годзе набор на будаўнічыя спецыяльнасці складаў у сталіцы тысячу чалавек, то ў 2008 годзе ён павялічыўся ўжо да 2,8 тысячы. Аднак менавіта спецыяльнасці будаўнічага профілю камплектуюцца з асаблівымі цяжкасцямі. Сур'ёзныя праблемы з запаўненнем месцаў адчуваюць кожны год і прафтэхустановы, якія рыхтуюць кадры для машынабудаўнічай галіны, металаапрацоўкі, лёгкай і перапрацоўчай прамысловасці. А ў рэгіёнах — установы, дзе рыхтуюць спецыялістаў для сельскай гаспадаркі.

На думку **рэктара Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзя ШКЛЯРА,** сістэма прафтэхадукацыі павінна сёння не проста паспяваць за вытворчасцю, але ў чымсьці яе апярэджваць. У новым навучальным годзе ў прафесійна-тэхнічным каледжы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі распачнецца падрыхтоўка па зусім новай для Беларусі спецыяльнасці «мехатроніка». Плануецца набраць 60 чалавек. Для таго, каб яе адкрыць, давялося стварыць у навучальнай установе палігон суперсучаснай тэхнікі. Больш як 15 прадпрыемстваў і арганізацый агульнымі намаганнямі стварылі ў каледжы сапраўдны тэхнапарк. А майстры вытворчага навучання і педагогі былі накіраваныя на стажыроўкі ў Германію і Англію.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Калі раней на вытворчасці ў машынабудаванні былі задзейнічаны слесары-рамонтнікі, электрыкі, слесары па рамонце пнеўматыкі, гідраўлікі, то сучаснай вытворчасці з яе гнуткімі інфармацыйнымі сістэмамі патрабуецца спецыяліст, які б быў знаёмы адначасова і з электронікай, і з пнеўматыкай, і з гідраўлікай, і з механікай. Прасцей кажучы, мехатронік — гэта спецыяліст, які дасканала ведае і механічную, і электронную часткі абсталявання, — патлумачыў сутнасць новай прафесіі Аркадзь Шкляр. — Праз тры гады каледж падрыхтуе рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія змогуць не толькі працаваць на станках з лічбавым кіраваннем, але і абслугоўваць іх, а таксама ўдасканальваць.

Летась у сталічнай ПТВ № 8 прыборабудавання пачалі рыхтаваць на аснове базавай адукацыі слесараў-зборшчыкаў лятальных апаратаў, а на аснове сярэдняй адукацыі — зборшчыкаў-клёпачнікаў лятальных апаратаў. Сфера іх прымянення — рамонт авіятэхнікі. А ў ПТВ № 55 з'явілася новая спецыялізацыя ў сталяроў — паркетныя работы. Можна не сумнявацца, што гэтыя спецыялісты без работы не застануцца. Увогуле шанцы застацца беспрацоўнымі ў прадстаўнікоў рабочых прафесій — мінімальныя, але ці разумеюць гэта маладыя людзі? Чаму пераважная іх большасць скіраваная на навучанне ў ВНУ?

— Я мяркую, што педагогам трэба праводзіць з выпускнікамі мэтанакіраваную і вельмі карэктную работу, — падзяліўся сваім бачаннем гэтай сітуацыі Барыс Іваноў. — Задача школы — навучыць сваіх выхаванцаў адэкватнай самаацэнцы, падказаць, якія могуць быць шляхі прафесійнага самавызначэння, на прыкладах прадэманстраваць, што выбар будучай прафесіі зусім неабавязкова павінен быць звязаны з навучаннем у ВНУ. Нашы навучэнцы яшчэ падчас вытворчай практыкі атрымліваюць па 400-600 тысяч рублёў. І на выхадзе з прафтэхустановы гэта ўжо самастойныя дарослыя людзі, якія могуць далей распараджацца ўласным жыццём. Хачу дадаць, што заказчыкі кадраў вельмі прыязна ставяцца да маладых людзей, якія паступаюць у прафтэхустановы на аснове базавай адукацыі, таму што за тры гады навучання яны, як правіла, паспяваюць «захварэць» сваёй прафесіяй. Вельмі шмат у здзяйсненні падлеткам прафесійнага выбару залежыць і ад бацькоў, якія нярэдка навязваюць дзецям сваё бачанне іх будучыні і не ўлічваюць, ці ёсць у дзіцяці здольнасці да навучання, ці ёсць схільнасць да абранай прафесіі. Магчыма, усё ж такі ёсць сэнс узброіць дзіця рабочай прафесіяй, якая заўсёды зможа яго пракарміць, чым дарэмна губляць час і грошы...

Надзея НІКАЛАЕВА.

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ СТАЛІЧНЫХ ПРАФТЭХУСТАНОЎ З САМЫМІ ВЫСОКІМІ ПРАХАДНЫМІ БАЛАМІ ДАКУМЕНТА АБ АДУКАЦЫІ

На аснове базавай адукацыі:

«сакратар-машыністка; касір-кантралёр аддзялення банка» у Мінскім дзяржаўным прафесійна-

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ:

в извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельного участка, об. пл. 0,1414 га, в д. Ляховщина Минского района, опубликованном в газете «Звязда» от 15.05.2009 г., вносится изменение:

ЗАЯВЛЕНИЯ НА УЧАСТИЕ И НЕОБХОДИМЫЕ ДОКУМЕНТЫ ПРИНИМАЮТСЯ ПО 10.06.2009 г. ДО 17.00.

Тел. (8 017) 224 61 34. www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже комплекса зданий и сооружений, в состав которого входят: здание холодильника, здание погреба, гараж, проходная и сооружения (пожарный резервуар, металлический и бетонный забор), расположенного по адресу: г. Брест, ул. Форт, 7.

Брестское Районное Потребительское Общество (Продавец) совместно с ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят повторный открытый аукцион по продаже комплекса зданий и сооружений, в состав которого входят: здание холодильника, здание погреба, гараж, проходная и сооружения (пожарный резервуар, металлический и бетонный забор), расположенного по адресу: г. Брест, ул. Форт, 7.

Общая площадь земельного участка для содержания и обслуживания холодильника составляет 1,3394 га, расположенного по адресу: г. Брест, ул. Форт, 7 по решению исполкома об отводе земли № 935 от 08.06.2007.

Начальная цена – 745 000 000 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 5 % от начальной цены, сумма задатка 37 250 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 12/09 от 18.05.2009 г., без НДС»).

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 12/09 от 18.05.2009 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 5-ти банковских дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **10.06.2009 года** в 14.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, комн. 1210.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.06.2009 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Объект продается без условий.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Контактный телефон в Минске: (8017) 226 94 83.

«Дазвол грамадзянам карыстацца сеткамі будзе мець негатыўныя наступствы»

Рэзананс

16 мая «Звязда» надрукавала інфармацыю адносна таго, што, магчыма, рыбаловам-аматарам краіны дазволяць лавіць рыбу сеткамі. І хоць падкрэслівалася, што канчатковае рашэнне яшчэ не прынята, пытанне патрабуе дэталёвай прапрацоўкі, і нават калі такая прапанова знойдзе падтрымку і ў заканадаўства будуць запланаваны да ўнясення адпаведныя змяненні, такі від інтэнсіўнага рыбалоўства будзе мець пэўныя абмежаванні (памер сетак, пералік вадаёмаў, дзе такая лоўля можа быць дазволена), такая пагалоска ўзняла ў асяроддзі сапраўдных рыбаловаў хвалю пратэсту. Грамадскае аб'яднанне «Вялікі рыбалоўны інтэрнэт-клуб» распачало акцыю па зборы подпісаў супраць прыняцця такога рашэння ўвогуле, хоць, як было сказана, фактычна яно нават яшчэ нікім і не ініцыявалася. Гучалі нават заклікі падаць заяўку ў Мінгарвыканкам на правядзенне мітынгу або пікета.

У сувязі з усім вышэйсказаным Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь палічыла неабходным выказаць сваё афіцыйнае меркаванне па азначанай тэме. Тым больш, што да яе паступалі шматлікія звароты з гэтай жа нагоды.

«Пытанне, звязанае з дазволам выкарыстоўваць пры аматарскім рыбалоўстве сеткавыя прылады лоўлі ўзнімалася неаднаразова і раней. Загадам Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №188 «Аб зацвярджэнні палажэнняў аб платнай аматарскай лоўлі рыбы, уключаючы падводнае паляванне, і здабычы водных беспазванковых для асабістага спажывання і пералікаў вадаёмаў для арганізацыі платнай аматарскай лоўлі рыбы» ад 30 чэрвеня 1999 года, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам было дадзена права арганізоўваць лоўлю рыбы прыладамі рыбалоўства з сеткаматэрыялаў на асобных вадаёмах, пералік якіх зацвярджаўся Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя адзін раз у пяць гадоў, а таксама ў рыбалоўных угоддзях, арандаваных для арганізацыі платнага аматарскага рыбалоўства. Гэты дакумент дзейнічаў больш за шэсць гадоў (страціў сілу 28.02.2006 г.), аднак за гэты час ні адзін райвыканкам рашэння па арганізацыі грамадзянамі лоўлі рыбы прыладамі з сеткаматэрыялаў не прыняў.

Зараз магчымасць атрымання грамадзянамі права выкарыстоўваць пры аматарскай лоўлі сеткавыя прылады разглядаецца ў органах дзяржаўнага рыбалоўнага кантролю. Прыняцце рашэння па гэтым пытанні будзе грунтавацца на заключэнні спецыялістаў Нацыянальнай акадэміі навук, у тым ліку аб магчымых экалагічных рызыках, пры гэтым будзе ўлічвацца меркаванне грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку рыбаловаў-аматараў.

Выходзячы з вопыту практычнай дзейнасці Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, атрыманне права выкарыстання грамадзянамі пры ажыццяўленні аматарскага рыбалоўства сеткавых прыладаў лоўлі пацягне за сабой шэраг негатыўных наступстваў, у тым ліку скарачэнне рыбных запасаў у рыбалоўных угоддзях рэспублікі. **Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь не падтрымлівае прыняцце гэтага рашэння».**

Ад рэдакцыі ў якасці своеасаблівай рэмаркі хацелася б дадаць толькі адно. Гэта, бясспрэчна, простае супадзенне, але вельмі сімвалічнае: у Год роднай зямлі найперш грамадзяне ў асобе рыбаловаў-аматараў выступілі катэгарычна супраць узаконьвання браканьерства (менавіта ў такім кантэксце многія і ўспрынялі магчымыя новаўвядзенні). І такую пазіцыю, што зыходзіць, як прынята гаварыць, знізу, трэба толькі вітаць. Калі некалькі гадоў таму ў Правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства прымяліся змяненні і дапаўненні, гаварылася, што многія з іх (тая ж лоўля падчас веснавога нерасту рыбы) скіраваны на карысць грамадзяніна, якому давяраюць, не бачаць у ім першапачаткова парушальніка-браканьера. Думаецца, такі давер цяпер цалкам апраўданы з боку саміх, як высветлілася, цалкам нераўнадушных да роднай зямлі рыбаловаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Падрабязнасці

ЛАСІХА ТРАПІЛА Ў БАСЕЙН

Супрацоўнікі прадпрыемства «Рэчыцадрэў» раніцай, калі прыйшлі на працу, убачылі на тэрыторыі лясную жывёліну, якая трапіла ў басейн для адмакання драўніны глыбінёй тры метры. На шчасце, вады ў ім на той момант не было. Спачатку зрабілі спробы змайстраваць з дошак памост, але ж маладая ласіха была вельмі напужаная і не прымала такі спосаб выратавання. Дозы снатворнага мясцовых паляўнічых для часовага ўсыплення вялікай жывёліны не хапіла, і таму было прынята рашэнне выклікаць з Гомеля супрацоўнікаў пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада абласнога ўпраўлення МНС. Тыя выкарысталі для ўсыплення ласіхі газабалонны пісталет для транквілізацыі. Абезрухоміць маладую, але вельмі магутную жывёліну атрымалася не адразу, бо яна гойсала па дне катлавана. Пасля паўторнай ін'екцыі ласіха нарэшце заснула. Калі лекі звалілі лясную прыгажуню, людзі яе звязалі і бераўліва пераклалі на вялізны паддон, а потым з дапамогай казлавога крана паклалі на аўтамабіль. Супрацоўнікамі аховы прыроды было прынята рашэнне перавезці жывёліну на другі бераг Дняпра. Па меркаваннях, менавіта адтуль яна магла прыплысці на прадпрыемства. У лесапаласе каля вёскі Копань ласіху выгрузілі. На вачах сваіх выратавальнікаў яна паднялася, і, хістаючыся, знікла ў лесе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАЗАГАРАЛІ...

Жыхар Баранавічаў запрасіў сваю знаёмую адпачыць на вадасховішчы Мышанка.

Падчас адпачынку мужчына выклікаў «хуткую дапамогу» і расказаў дактарам, што жанчыне стала кепска. Пры гэтым ён не назваў сваё прозвішча і сышоў. А ў бальніцы 30-гадовую жанчыну абследавалі і ўстанавілі, што ёй нанесены шматлікія траўмы. Выратаваць пацярпелую не ўдалася і яна на другія суткі памерла ў рэанімацыйным аддзяленні.

Да справы падключылася міліцыя і праз тры дні высветлілася, што пацярпелую пабіў мужчына, які запрасіў яе адпачыць. Там ён прыраўнаваў жанчыну да загараючых побач мужчын і вырашыў правучыць — «надаваць па рэбрах».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже недвижимого имущественного комплекса – зданий и сооружений бывшего Комбината кооперативной промышленности, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Дзержинского, д. 4.

Бобруйское районное потребительское общество совместно с ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – зданий и сооружений бывшего Комбината кооперативной промышленности, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Дзержинского, д. 4.

Состав недвижимого имущественного комплекса:

Наименование строения, год постройки	Характеристика строения	Общая площадь строения
Гаражи, столярная мастерская, 1996	фундамент – бетонный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	238 м²
Контора, 1986	фундамент — кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – бревна, облицованные кирпичом; перегородки – кирпичные и дощатые	450,5 м²
Материальный склад,1957	фундамент – кирпичный, бетонный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	1277,8 м²
Склад готовой продукции, 1952	фундамент – кирпичный, бетонный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	755,8 м²
Уборная, 1964	фундамент – деревянные столбы; наружные, внутренние капитальные стены – дощатые; перегородки – дощатые	6,3 м²
Склад-навес тары, 1984	фундамент – металлические столбы; наружные, внутренние капитальные стены – шифер	567,7 м²
Весовая, 1956	фундамент – бетонный, кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	3,3 м²
Гараж, 1966	фундамент – кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перекрытия чердачные – железобетонные	171,4 м²
АЗС, 1996	фундамент – кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	6,0 м²
Склад тары, 1954	фундамент – бетонный, кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные	186,5 м²
Проходная, 1962	фундамент – бетонный; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки – кирпичные	8,1 м²
Склад-навес сырья, 1994	фундамент – металлические столбы; наружные, внутренние капитальные стены – шифер и металлическая сетка	292,9 м²
Магазин, 1994	фундамент – кирпичный; наружные, внутренние капитальные стены – бревна, облицованные кирпичом; перегородки бревна, дощатые	102,2 м²
Консервный цех, 1946	фундамент – бутовый; наружные, внутренние капитальные стены – кирпичные; перегородки - кирпичные	802,5 м²

Общая площадь земельного участка для обслуживания недвижимого имущественного комплекса составляет 0,8799 га.

Начальная цена составляет – 745 425 209 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 3 % от начальной цены, сумма задатка 22 362 756 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 08/09 от 19.05.2009 г., без НДС»).

Аукцион состоится **23.06.2009 года** в 14.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1210.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.06.2009 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 08/09 от 19.05.2009 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 5-ти банковских дней с даты проведения аукциона.

Для участия в аукционе юридическое лицо, гражданин или индивидуальный предприниматель (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в адрес организатора аукциона:

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора аукциона;
- юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение платы за участие в аукционе в размере 257 290 белорусских рублей;
- индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
- представителем физического лица – резидента Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность, паспорт;
- физическим лицом – паспорт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Бобруйского районного потребительского общества к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Контактные телефоны: в Минске – (8017) 226 94 83, в Бобруйске – (80225) 46 81 00.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 26 июня 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Габровская	0,2697	50 лет	Строительство и обслуживание административно-складской базы	740100000005003822	50 768 000	4 569 000
№ 2	улица Первомайская (р-н жилого дома № 72)	0,0828	50 лет	Строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе	740100000003005439	27 119 000	2 441 000
№ 3	улица Ямницкая (ограничения – 0,0562 га (охранная зона линии электропередачи)	0,0800	50 лет	Строительство и обслуживание складских помещений	740100000003005397	5 450 000	491 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 22.06.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 23 июня 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	проспект Пушкинский, ост. «Ул. Островского» (от центра)	0,0093	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торговых киосков в остановочном павильоне	740100000005000272	270 000	24 000
№ 2	улица Гагарина, ост. «Ул. Гагарина» (ранее ост. «Ледовый дворец»)	0,0060	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005001818	141 000	13 000
№ 3	улица Крупской, ост. «Ул. Крупской» (от центра)	0,0048	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000002000179	138 000	12 000
№ 4	улица Островского (р-н жилых домов №№ 93, 95)	0,0064	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000006000439	138 000	12 000
№ 5	улица Гагарина (р-н жилого дома № 34а)	0,0064	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005001236	170 000	15 000
№ 6	проспект Витебский, ост. «Автозавод им.С.М. Кирова»	0,0056	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000007004715	136 000	12 000
№ 7	бульвар Ленина (р-н Белорусско-Российского университета)	0,0016	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового объекта «быстрого питания»	740100000004002845	54 000	5 000
№ 8	улица Крыленко	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового объекта «быстрого питания»	740100000003005008	39 000	4 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предметов аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 17.06.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

Спорт-тайм

З КУБКАМ УЕФА — ДАНЕЦКІ «ШАХЦЁР»

Апошнім уладальнікам Кубка УЕФА па футболе, які з наступнага сезона, змяніўшы фармат, атрымае новую назву — Ліга Еўропы, стаў украінскі «Шахцёр». У фінальным матчы ў Стамбуле з лікам 2:1 у дадатковы час ён перамог нямецкі «Вердэр».

Пасля асноўных 90 хвілін лік у матчы быў нічыйны 1:1. Спачатку Луіс Адрэана выкарыстаў памылку цэнтральных абаронцаў, выйшаў адзін на адзін з Візэ і пракінуў нямецкага галкіпера. Затым Налда моцным ударам прабіў рукі «шахцёра» Пятава. Галкіпер украінскай каманды вырашыў лавіць мяч, але не разлічыў і фактычна сам закінуў яго сабе ў вароты. У дадатковы час нямецкі варатар Візэ адказаў сваёй памылкай на няўпэўненую гульню Пятава ў першым тайме. На ўдар Жадсана галкіпер адрэагаваў, але ўтрымаць мяч у руках не здолеў і той павольна закаціўся ў правы вугал.

Пасля гульні настаўнік пераможцаў Мірчы Лучэску адзначыў, што вынік заканамерны і яго падапечныя правамерна святкуюць перамогу ў гістарычным фінале. У той жа час трэнер «Вердэра» Томас Шааф сказаў, што яго футбалісты былі негатовыя атакаваць са звыклым размахам і не змаглі стрымаць хуткіх маладых данецкіх бразільцаў, якія і вырашылі лёс паядынку.

На матчы ў Стамбуле прысутнічалі прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка і прэзідэнт УЕФА Мішэль Плаціні.

На слыху

ЗАСНУЎ У МАШЫНЕ І АТРУЦІЎСЯ

Вадзіцель Кобрынскага аўтапарка загінуў ад атручэння чадным газам у кабіне службовай машыны МАЗ. 43-гадовы кабрынчанін быў накіраваны ў камандзіроўку ў вёску Камянюкі Камянецкага раёна. Там і заначаваў у кабіне сваёй машыны. А каб сагрэцца, уключыў газавую гарэлку. Потым заснуў і ўжо не прачнуўся. Цела яго знайшоў вартаўнік стаянкі толькі раніцай. Падрабязнасці трагедыі высвятляе Камянецкая пракуратура.

Яна СВЕТАВА.

ПСОТА ЗАСТАЛАСЯ, А ГРОШЫ ЗНІКЛІ

Мужчыны ніякага ліха не баяцца, іх сурокамі не напалохаеш, а вось жанчыны пастаянна трапляюць у рукі прайдзісветаў.

Каля цырульні па вул. Маскоўскай у Брэсце да 35-гадовай жанчыны падышла невядомая і прапанавала зняць з яе сурокі.

Псота засталася пры падманутай, а 50 еўра, 175 долараў і амаль 5 млн рублёў ашуканка забрала сабе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АДНАЧАСОВА — ЧАТЫРЫ ПАДПАЛЫ

Нечакана запалалі каля апоўначы рублены дом-дача і хлеў у пасёлку Усход Буда-Кашалёўскага раёна. Літаральна ў той жа час на іншым канцы гэтага населенага пункта агонь захапіў шыферны дах іншага дома і прыбудовы да яго, якія выкарыстоўваліся таксама толькі летам. Практычна ўся маёмасць у абодвух выпадках знішчана. Аналагічная сітуацыя адбылася той жа ноччу ў вёсцы Габрылееўка Нараўлянскага раёна. Невядомы падпаліў шыферны дах і перакрыцце дома з бярвення. Праз 25 хвілін з населенага пункта зноў выклікалі выратавальнікаў. У апошнім выпадку падпалены хлеў паспелі патушыць. Міліцыя і супрацоўнікі МНС мяркуюць, што ва ўсіх чатырох здарэннях быў чыйсьці наўмысны намер пазбавіць гаспадароў маёмасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СЯРОД СВАІХ

Жыццё паказвае, што калі на нейкім прадпрыемстве нешта знікла, то злодзея найперш трэба шукаць сярод сваіх работнікаў.

Вось на адным ЗАТ у Пінску са склада знікла 120 кв. метраў тратуарнай плітки. І міліцыя затрымала двух вадзіцеляў гэтага прадпрыемства, якія тую плітку і ўкралі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Галіна ВАЛЖАНКІНА:

«ДЗЯРЖАЎНЫ ПАКЕТ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДАПАМОГІ — НЯЗМЕННЫ»

Развіццё сістэмы аховы здароўя па-ранейшаму застаецца адным з асноўных нацыянальных прыярытэтаў. Апошнім часам у медыцынскай галіне адбываюцца сапраўды кардынальныя змяненні. Усе такія пераўтварэнні павінны прывесці да адчувальнага паляпшэння якасці, павышэння даступнасці паслуг. Ці ўдалося дасягнуць пажаданага выніку, якая дынаміка адзначаецца ў паказчыках стану здароўя беларусаў? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае начальнік управлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Галіна ВАЛЖАНКІНА.

«Абследаванне павінен праходзіць кожны»

— У Беларусі быў абраны курс на актыўную мадэрнізацыю структуры аховы здароўя, — заўважае Галіна Вітальеўна. — Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца першаснаму ўзроўню аказання медыцынскай дапамогі. Працягваецца перааснашчэнне цэнтральных раённых бальніц, амбулаторый, умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база паліклінік. У такім разе ў спецыялістаў, якія працуюць у адпаведных медыцынскіх установах, з'яўляюцца новыя магчымасці. У сваю чаргу для пацыентаў павялічваецца даступнасць да сучасных методык дыягностыкі і лячэння захворванняў. Гэта надзвычай важны момант, паколькі менавіта на першасным узроўні можна выявіць адхіленні ў стане здароўя чалавека на ранняй стадыі і своечасова іх скарэктаваць. Тут, безумоўна, шмат залежыць ад кожнага з нас.

Не варта чакаць, калі ў вас нешта забаліць і тады ўзнікне неабходнасць звярнуцца па дапамогу да медыкаў. Трэба памятаць, што многія захворванні доўгі час развіваюцца без яўных сімптомаў. Калі ўпусціць час, то гэта можа прывесці да самых сур'ёзных наступстваў. На жаль, далёка не ўсе для сябе зацвердзілі такую аксіёму. Даводзіцца нагадваць, што медыцынскае абследаванне рэгулярна павінен праходзіць кожны. Пасля 40 гадоў неабходна абавязкова вызначаць узровень халестэрыну. Гэты аналіз дазваляе выявіць развіццё атэрасклерозу, а, значыць, магчымых інфарктаў, інсультаў — захворванняў, якія могуць прывесці да інваліднасці. Таксама трэба вымяраць артэрыяльны ціск, рабіць электракардыяграму і г.д. Неабходна сур'ёзна вызначыць свае прыярытэты, каб зберагчы здароўе.

— Летась праводзілася агульная дыспансэрызацыя насельніцтва. Ці будзе працягвацца такая практыка надалей?

— У мінулым годзе быў праведзены агляд 98,8 працэнта дарослага насельніцтва. Зразумела, такія мерапрыемствы заўсёды апраўданыя і прыносяць відавочную карысць. Як вядома, існуе цесная ўзаемасувязь паміж патэнцыялам здароўя насельніцтва і эканамічным ростам дзяржавы. Спадзяёмся, што адпаведная работа будзе працягвацца і надалей. Цяпер варта аб'яднаць намаганні работнікаў установ аховы здароўя, кіраўнікоў прадпрыемстваў, прафсаюзных камітэтаў, каб рэалізаваць меры, якія прапануюцца па выніках праведзеных прафілактычных агляд работнікаў. Сёлета асноўная ўвага будзе надавацца дыспансэрнаму назіранню і выкананню індывідуальных праграм прафілактыкі пацыентаў групы рызыкі, асабліва сярод працаздольнага насельніцтва.

Будзе праведзены 100-працэнты медыцынскі агляд інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, членаў сем'яў людзей, якія загінулі падчас выканання вайсковых абавязкаў у гады Вялікай Айчыннай ці ў дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні. Будзем працягваць работу па прафілактыцы не толькі фактараў рызыкі развіцця захворванняў, але і тых негатыўных тэндэнцый у грамадстве, якія перашкаджаюць вярнуць страчанае здароўе хворым і захаваць яго здаровым грамадзянам. Фарміраванне моды на здаровы лад жыцця — гэта не прыгожыя словы, а спроба кардынальна змяніць сітуацыю.

— Галіна Вітальеўна, наколькі сур'ёзныя такія апасенні?

— Міністэрства аховы здароўя надзвычай непакоіць тое, што працягваецца рост аб'ёмаў продажу алкагольных напояў. Летась адпаведны паказчык дасягнуў свайго максімуму — у пераліку на абсалютны алкаголь было рэалізавана 12,39 літра на душу насельніцтва. Гэта на 5,2 працэнта больш, чым у 2007-м. Колькасць суіцыдаў сёлета за студзень—сакавік зменшылася ў параўнанні з такім жа перыядам летась, аднак варта ўлічваць, што больш за палову самагубстваў здзейсненыя ў стане алкагольнага ап'янення. Высокі ўзровень самагубстваў — вострая сацыяльная праблема. Асабліва небяспечная сітуацыя цяпер склалася ў Магілёўскай вобласці і ў Мінску. Працягваецца работа па стварэнні кансультацыйных наркалагічных, псіхіятрычных і псіхолага-псіхатэрапеўтычных кабінетаў. У падлеткавай наркалагічнай службе рэгіёнаў дапамогу няпоўнагадовым аказвае спецыяльная мультыдысцыплінарная брыгада, у склад якой уваходзяць нарколаг, псіхолог і псіхатэрапеўт.

Для папярэджання алкагалізацыі насельніцтва (асабліва моладзі) Міністэрства аховы здароўя неаднаразова звярталася з прапановай разгледзець пытанне аб павелічэнні ўзросту, з якога дазволены продаж алкагольных напояў з 18 да 21 года. Разумееце, у 18-гадовым узросце нават невялікія дозы алкаголю могуць быць згубныя для арганізма. Таму тут павінна быць прынцыповая пазіцыя. Гэта ж датычыцца і ўжывання піва на вуліцы, курэння ў грамадскіх месцах. Неабходна павышаць эфектыўнасць усіх мераў, якія накіраваны на фарміраванне здаровага ладу жыцця, выхаванне адпаведнай культуры ў грамадстве.

«Укладанні ў медыцыну — інвестыцыі ў будучыню»

— Згодны, прафілактыка і ўважлівае стаўленне да свайго здароўя надзвычай важныя. Але ці не будуць пры гэтым згортвацца выдаткі на медыцыну?

— Дзяржаўныя выдаткі на ахову здароўя даволі значныя, удалося выйсці на аптымальны ўзровень фінансавання, які забяспечвае выкананне ўсіх мэтавых мерапрыемстваў. Варта адзначыць, што апошнім часам актывізаваліся і рэгіянальныя ўлады — летась узраслі выдаткі не толькі рэспубліканскага, але і мясцовых бюджэтаў. Усе добра разумеюць: укладанні ў медыцыну — гэта інвестыцыі ў будучыню.

— Але ж у асобных выпадках пацыент павінен разлічвацца за аказанне медыцынскай дапамогі з уласнай кішэні. Да прыкладу, у дзённыя стацыянары неабходна прыходзіць са сваімі лекамі...

— Сапраўды такая норма прапісана ў арт. 38 Закона «Аб ахове здароўя». Дзённыя стацыянары паліклінік — гэта амбулаторныя ўстановы. Вызначана, што вырабы медыцынскага прызначэння пацыентам даюцца бясплатна, а лекі людзі набываюць за ўласныя сродкі. Цяпер існуе такая сістэма, якая, нагадаю, адпавядае заканадаўчым нормам.

«Чэргі — з-за недахопу ўрачоў»

— У медыцыне таксама існуюць пэўныя крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці ўкладанняў. Найважнейшы сярод іх — паказчыкі здароўя насельніцтва. Якія тут адбываюцца змяненні?

— Цяпер узровень нараджальнасці і смяротнасці дае нам падставу засведчыць: з'явіўся ўнікальны шанц выйсці на станоўчыя суадносіны гэтых паказчыкаў. За першы квартал гэтага года ў Беларусі нарадзілася на 1,5 тысячы дзяцей больш, чым за такі ж час летась. Прычым такая тэндэнцыя захоўваецца на працягу некалькіх апошніх гадоў. У нашай дзяржаве самы нізкі сярод краін СНД паказчык дзіцячай смяротнасці. У першым квартале не было ніводнага выпадку мацярынскай смяротнасці. Гэта вынік рэалізацыі маштабнага комплексу мераў па ахове здароўя маці і дзяцей. Зменшылася колькасць памерлых у працаздольным узросце. Адзначаецца тэндэнцыя да павелічэння чаканай працягласці жыцця: на працягу 2006—2008 гадоў яна выросла з 69,4 да 70,3 года (для мужчын — з 63,6 да 64,5, а для жанчын — з 75,5 да 76,2). За адпаведны час практычна ўдвая скарацыўся каэфіцыент дэпапуляцыі, што сведчыць аб станоўчых змяненнях у дэмаграфічнай сітуацыі.

Разам з тым, становішча не варта ідэалізаваць. За першыя тры месяцы ў параўнанні з адпаведным перыядам летась узрасла колькасць памерлых. Гэта абумоўлена павелічэннем у структуры насельніцтва састарэлых людзей, адзначаўся рост памерлых ад анкалагічных і сардэчна-сасудзістых захворванняў. Захворванні сістэмы кровазвароту займаюць першае месца сярод прычын смерці. Але ў агульнай структуры адзначаецца іх зніжэнне. Пільная ўвага надаецца своечасовай дыягностыцы і лячэнню анкалагічных захворванняў. Распрацоўваецца дзяржаўная праграма «Анкалогія». Гэта акцэнт ад жыцця, паколькі сітуацыя з захваральнасцю даволі складаная. Мяркуецца перааснасціць адпаведныя ўстановы — ад паліклінік да рэспубліканскага цэнтра. Такія захады дазволяць выяўляць анкалагічныя захворванні на ранніх стадыях.

— Галоўны аргумент на карысць даступнасці медыцынскай дапамогі — магчымасць без усялякіх перашкод трапіць на прыём да патрэбнага спецыяліста. Аднак, будзем шчырымі, праблема вялікіх чэргаў у медыцынскіх установах (перш за ўсё ў паліклініках) застаецца надзвычай вострай. Ці магчыма ў найбліжэйшы час тут чакаць бачных змяненняў?

— Дасюль даволі вострай застаецца праблема належнай укамплектаванасці поліклінічнай сеткі ўрачэбнымі кадрамі. Прычым датычыцца гэта не толькі Мінска, але і шэрагу рэгіёнаў. Невысокі ўзровень аплаты працы прыводзіць да таго, што спецыялісты пераходзяць у камерцыйныя медыцынскія структуры, фармацэўтычныя фірмы. Калі не хапае ўрачоў, то вельмі складана змагацца з чэргамі. Калі спецыяліст вымушаны працаваць на 1,5 стаўкі і нават мець большую нагрузку, то ў шэрагу выпадкаў церпіць якасць абслугоўвання. У маладых урачоў так адбываецца з-за недахопу практыкі, а пенсіянерам (якіх у сістэме працуе значная колькасць) проста не па сілах такое напружанне. Магчыма, варта прывабліваць кадры больш высокімі заробкамі, а не павялічваць прыём у навучальныя ўстановы медыцынскага профілю. На маю думку, гэта больш прадукцыйны шлях.

Існуе шэраг рэзерваў паляпшэння аказання медыцынскай дапамогі на поліклінічным узроўні. Галоўным урачам неабходна максімальна выкарыстоўваць свае магчымасці як па тэхнічным перааснашчэнні, так і па ўдасканальванні арганізацыі прыёму пацыентаў. У паліклініках паступова ўкараняюцца сучасныя методыкі медыцынскага сэрвісу, адбываецца камп'ютарызацыя. Так што даступнасць дапамогі з цягам часу будзе павялічвацца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ, фота аўтара.

БУДЗЕ СУЧАСНЫ «САРДЭЧНЫ» КОМПЛЕКС

У Віцебску на базе абласнога кардыялагічнага дыспансэра ствараецца сучасны навукова-практычны комплекс. Як расказаў «Звяздзе» **доктар медыцынскіх навук, прафесар Уладзіслаў ПАДПАЛАЎ,** гэты цэнтр будзе працаваць на самым перадавым еўрапейскім узроўні.

Як адзначыў новы кіраўнік установы аховы здароўя «Віцебскі абласны кардыялагічны цэнтр» Уладзімір Лугавой, у цэнтры ў ліку іншага змогуць спрыяць і папулярызацыі наогул прафесіі кардыёлага, бо не сакрэт, што студэнты--медыкі не вельмі ахвотна выбіраюць гэтую так званую вузкую спецыяльнасць: у Прыдзвінскім краі працуюць толькі 68 кардыёлагаў, а неабходна каля 100.

Палова насельніцтва ў нашай краіне памірае менавіта ад кардыялагічных захворванняў. Не суцяшае статыстыка захворванняў: летась былі зарэгістраваны 1400 інфарктаў, і ў 3 разы больш інсультаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.56	21.17	16.21
Віцебск —	4.39	21.14	16.35
Магілёў —	4.46	21.07	16.21
Гомель —	4.51	20.56	16.05
Брэст —	5.13	21.31	16.18
Гродна —	5.21	21.24	16.03

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Іосіфа, Ісая, Мікалая.*
К. *Алены, Рыты, Юліі, Рамана, Урбана, Эміля, Яна.*

Фота Ілі ВАКУЛІЧА.

22 мая

Дзве даты

1906 год — амерыканскія вынаходнікі і пілоты браты Райт запатэнтавалі першы самалёт.

1936 год — стартаваў 1-ы чэмпіянат СССР па футболе. Ён працягваўся да 17 ліпеня. Пераможцам аднакругавога турніру з сямі камандаў стала маскоўскае «Дынама».

Цытата дня:

«Калі чалавек не адкрыў для сябе нешта такое, за што ён гатовы памерці, ён не здольны паўнавартасна жыць».

Марцін Лютэр Кінг (1929—1968), амерыканскі рэлігійны і палітычны дзеяч.

МІКОЛА ВЯСНОВЫ

Свет і сусвет чалавека

Ад Міколы заставалася 12 халодных раніш-нікаў.

Веснавы Мікола надвор'е становіць.

Святы Мікалай Цудатворац заўсёды карыстаўся асаблівай пашанай у славянскіх народаў. У гарадах і вёсках пабудаваны храмы ў яго гонар. На працягу года ў царкоўных набажэнствах кожны чацвер у шэрагу апостаталаў узгадваецца святы Мікалай. Свяціцелю Мікалаю Цудатворцу моляцца аб дзецях, аб добрых жаніхах і нявестах, аб ахоўніцтве сямейнага ачага, аб заступніцтве за ўдоў і сірот, аб спачуванні бедным і беззаборонным, аб дапамозе ў нястачах, аб выратаванні і захаванні вандроўнікаў па вадзе, ад розных бедаў і смутку, аб пазбаўленні ад хваробаў.

- Паўсюдна ў гэты дзень, каб пазбегнуць бедаў і нястачаў на працягу года, трэба было наладзіць святочны абед у гонар Мікалая і накарміць бедных, юродзівых, бадзяг. «Як не накорміш у Міколін дзень галодная, дык сам увесь год галодны будзеш». Потым стол накрывалі для сям'і. Лічылася, што ў гэты дзень садзіцца за стол трэба не менш за чатыры разы.
- Лічылася, што маразоў, якія могуць нашкодзіць пасевам, больш не будзе.
- Да гэтага дня неабходна было пасадзіць бульбу, пасеяць лён, гарох, проса.
- На Міколавым тыдні паўсюдна пачынаюць саджаць агуркі: «Калі надвор'е спрыяе, то ў добрай гаспадыні на Купалле будуць свежыя агуркі».
- Мікола вясновы — свята конюхаў. Паўсюдна ён лічыўся ахоўнікам коней, таму ў гэты дзень абавязкова служылі набажэнства, каб святы Мікола захаваў коней ад ваўкоў, мядзведзяў, рабаўнікоў і дрэнных людзей, дараваў здароўе. На святога Міколу пастухі абыходзілі хаты, і ў кожнай іх чакаў пачастунак.
- На Міколу выганялі коней на поле, на начны падножны корм: «Мікола вясновы коней накорміць, Мікола восеньскі на двор загоніць».
- Звычайна ў гэты дзень пачыналі стрыгчы авечак. Хто спозніцца нават на дзень, можа застацца без поўсці, таму што ў гэты час авечкі пачынаюць ліняць. Авечка магла пайсці на поле з поўсцю, а вярнуцца без яе.
- У народзе існавала строгая забарона купацца да вясновага Міколы.
- Сярод маракоў існавала правіла падчас буры выносіць цудатворны абраз Міколы на палубу і маліцца аб выратаванні.
- Халастыя юнакі ўсю ноч на Міколу павінны былі правесці за гульнямі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

—...Скаціна! Ізноў учора напіўся, а мне свой абванітаваны гальштук — на, маўляў, мый! Шкарпэткі свае смуродныя вечна падсоўвае! На мінулым тыдні з нейкай бабай прыпёрся — усю ноч супакою не давалі!..

— Матор!

— Добры дзень, я — першая пральная машына, якая ўмее размаўляць!..

☺

Калі адключылі ваду, я зразумеў, што інтэрнэт — не самае галоўнае ў доме.

☺

Прыходзіць Адам позна ўвечары дадому. Ева раўніва пытаецца:

— Дзе ты быў!?

— Дарагая, няўжо ты не ведаеш, што ў раі мы адны.

Але кожную ноч, калі Адам засынаў, Ева на ўсякі выпадак пералічвала яму рабрыны.

☺

Грамадзяне бацькі!
Памятайце, што пакінутыя без нагляду маленькія дзеці вельмі хутка становяцца маленькімі бацькамі!



Гэта мы, Госпадзі...

У Слуцку знішчалі гнёзды гракоў, а птушанят палілі на вогнішчах

Аб жудасным выпадку масавага забойства птушак на тэрыторыі побач з мясцовым ільнозаводам Слуцка паведамілі рэдакцыі спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». 19 і 20 мая людзі ў спецвопратцы спілоўвалі дрэвы, на якіх пабудавалі свае гнёзды гракі. Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН паведаміў:

— Да моманту прыбыцця на месца падзей спецыяліста АПБ Сяргея Зуёнка на зямлі заставаліся ляжаць каля 25 скінутых гнёздаў і 25 мёртвых птушанят. Рабочыя ў гэты час актыўна дапілоўвалі галінкі і палілі ў вогнішчы рэшткі гнёздаў і мёртвых птушак. Паводле слоў актывісткі АПБ Таццяны Якімавай, раніцай таго ж дня яна налічыла на зямлі не менш за 50 трупаў птушанят.

— Пры сяроднім памеры вывадка ў гракоў у 3—5 птушанят, і прыкладна 10 жылых гнёздаў на адным гнездавым дрэве, загінула як мінімум 200 грачанят, якія так і не паспелі пакінуць гнёзды, — адзначыў Сяргей Зуёнак, супрацоўнік АПБ па прыродаахоўных пытаннях.

Падчышчалі сляды злачынства работнікі Слуцкага ААТ «Льнозавод». З іх слоў, загад «навесці парадак» паступіў ад дырэктара льнозавода. Дырэктар жа прадпрыемства, які наадрэз адмовіўся даваць інтэрв'ю здымачнай групе СТБ, што аператыўна прыбыла на месца здарэння разам са спецыялістам АПБ, паведаміў, што калонія была знішчана гарадскімі ўладамі, аднак... па яго асабістай просьбе. Чым жа не дагадзілі птушкі дырэктару льнозавода? Паводле яго цвёрдага меркавання, гракі літаральна затэрарызавалі дарослых насельнікаў навакольля і іх дзяцей сваімі не вельмі меладычнымі галасамі і звычкай кідаць «бомбачкі» памёту ў розных месцах.

У Вялікабрытаніі ўладальнікі сядзібаў усяляк стараюцца прывабіць у свае паркі гракоў, якія, паводле павер'яў, прыносяць шчасце. Мірна суіснавалі з гракамі і беларусы — у нашым фальклоры гракі займаюць сваё «пачэснае» месца.

Аднак у апошнія гады грачыныя калоніі становяцца ўсё больш частымі ахвярамі кампаніі па добраўпарадкаванні гарадоў і пасёлкаў. Нягледзячы на магчымасць спілаваць гнёзды зімой, без знішчэння птушанят, гарадскія службы часта схамянаюцца толькі ў разгар вясны. Але ад рашэння знішчыць калонію не адступаюць, нават нягледзячы на наяўнасць птушанят у гнёздах. Такія выпадкі адзначаліся, напрыклад, у Маларыце, Кобрыне, іншых гарадах.

— Знішчэнне гнёздаў гракоў з птушанятамі ў Слуцку — грубае парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства — Закона Рэспублікі Беларусь «Аб жывёльным свеце». А знішчэнне птушанят, згодна з вызначанымі таксамі, караецца штрафам у памеры 3 базавых велічынь за адзін знішчаны экзэмпляр, — заявіў **дырэктар АПБ Віктар ФЯНЧУК.**

Адметна, што ў большасці выпадкаў, знішчэнне гнёздаў не вырашае праблемы, бо калонія ўжо на наступны год перамяшчаецца на іншыя дрэвы ў найбліжэйшым наваколлі. Наўрад ці стане выключэннем і калонія ў Слуцку. Наяўнасць буйной калоніі гракоў паблізу палёў — сапраўдны падарунак для землеўладальнікаў, бо аснову харчавання гракоў складаюць насякомыя і іх лічынкі — шкоднікі сельскагаспадарчых культур.

Слуцкай трагедыі, якая адбылася на вачах у шматлікіх гараджан — дзяцей і дарослых — можна было лёгка пазбегнуць: да вылету птушанят з гнёздаў заставалася не больш як два тыдні. Афіцыйна ж падобныя «мерапрыемствы», згодна з заканадаўствам, не забаронена праводзіць у перыяд з 15 кастрычніка па 15 красавіка.

Грачыная калонія знішчана напярэдадні Сусветнага дня біялагічнай разнастайнасці, у дзень падпісання Канвенцыі аб біяразнастайнасці. Гэта канвенцыя ратыфікавана і Рэспублікай Беларусь.

Па гэтым факце АПБ звярнулася з афіцыйным лістом у Мінпрыроды і ў Дзяржаўную інспекцыю аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сяргей ПАЛІНІН.

МТС — аграгарадкам

НА БЕРАГАХ БЯРЭЗІНСКАГА КАНАЛА

Сёння ў нашай пастаяннай рубрыцы расповед пра Лепельскі раён. Бадай, больш за ўсё ён вядомы тым, што менавіта тут знаходзіцца знакаміты Бярэзінскі біясферны запаведнік.

Тут можна на свае вочы ўбачыць рэдкіх жывёл, тут захоўваюцца рэдкія віды раслін. Штогод у гэты запаведнік прыязджаюць адпачыць шмат людзей з розных краін.

Частка з іх спыняецца ў вельмі добрым гатэлі, што ў запаведніку. Яшчэ адзін сучасны гатэль будзе пабудаваны і ў самім райцэнтры. Інвестары знайшліся аж у Балгарыі. Дзіўна, што раней не было гасцініцы ў такім вялікім горадзе, які месціцца акурат паміж Мінскам і Віцебскам. Але, як кажуць — лепш позней, чым ніколі. У выніку еўрапейцы, ды і мы з вамі зможам спыніцца ва ўтульных нумарах і атрымаць еўрапейскі сэрвіс.

Тыя ж, хто стаміўся ад гарадской мітусні, аддаюць перавагу хатняй гасціннасці, прыязджаюць і, безумоўна, будуць прыязджаць у так званыя прыватныя сельскія аграгурыстычныя сядзібы. Такіх у Лепельскім раёне ўжо болей за дзесяць. Гаспадары прыватных аграгурыстычных сядзібаў і смачна накормяць традыцыйнымі нацыянальнымі беларускімі стравамі, і прапануюць багатую праграму адпачынку. Тут вам і рыбалка, і грыбы, ягады. А ў лазню? Калі ласка! Мясцовыя жыхары на конях пакатаюць, прапануюць паўдзельнічаць у старадаўніх абрадах (на фота), сыграюць на народных інструментах. А яшчэ на памяць па вельмі даступных цэнах можна купіць дзіўныя вырабы тутэйшых народных майстроў.

А ці ведаеце вы, што ў раёне ёсць аналаг знакамітага Аўгустоўскага канала — Бярэзінская водная сістэма? І сёння можна ўбачыць старыя шлюзы, якія цудам захаваліся. Старажылы могуць расказаць, якім быў гэты водны шлях дзясяткі гадоў таму. Цяпер распрацоўваюцца спецыяльныя турыстычныя маршруты па воднай сістэме. Ёсць планы яе поўнага аднаўлення.

Што датычыцца «галоўных герояў» публікацый нашай рубрыкі — аграгарадкоў, іх у Лепельскім раёне ўжо шмат. Услухайцеся ў іх каларытныя назвы: Вялікі Поўсвіж, Камень, Старое Лядна, Баброва... За мінулыя чатыры гады на стварэнне аграгарадкоў патрачаны каля 9,3 мільярда рублёў дзяржаўных грошай. Сума вялікая, але гэтыя мільярды ўкладзены разумна — каб мадэрнізаваць сельскагаспадарчую вытворчасць, каб умовы пражывання вяскоўцаў наблізіць да гарадскога ўзроўню. І інвестыцыі пачынаюць сябе акупляць. У прыватнасці, летась тут прадалі сельскагаспадарчай прадукцыі значна болей, чым пазалетась, а ўсе без выключэння гаспадаркі спрацавалі з прыбыткам.

Асабіста мне вельмі падабаецца аграгарадок Камень. Пра яго мы ўжо пісалі. Параўнальна вялікі і такі прыгожы населены пункт — вельмі жывапісны «пункт» на карце Лепельскага раёна. Мясцовыя жыхары тут вельмі адкрытыя, яны цэняць слаўную гісторыю сваёй малой Радзімы. Абавязкова, калі будзеце ў тых мясцінах, наведайце Камень...

Наступны факт без каментарыяў. Усе ўладальнікі сядзібаў, з якімі я пазнаёміўся падчас камандзіроўкі, — даўнія абаненты кампаніі МТС. Літаральна ўсе! Адпаведна, каб дамовіцца пра нюансы вашага запланаванага візіту, значна выгадней і зручней тэлефанаваць гэтым гаспадарам, з'яўляючыся абанентам МТС.

Сувязь ад МТС у Лепельскім раёне, як і ў астатніх, дзейнічае надзейна. У выніку заўсёды абаненты кампаніі МТС застаюцца мабільнымі ў любы час сутак, у кожным пункце раёна, пры любым, самым дрэнным надвор'і.

Прыемна, што МТС — вядучы аператар мабільнай сувязі — вельмі шмат ўвагі надае «мабілізацыі» менавіта правінцыі, глыбінцы. Тых жа аграгарадкоў, якіх у зоне пакрыцця сувяззю МТС у вобласці — ужо звыш 240! І колькасць іх павялічваецца хуткімі тэмпамі. Гэта работа праводзіцца згодна з адпаведным планам аблвыканкама.

Як адзначыў дырэктар Віцебскага філіяла МТС Уладзіслаў Андрэйчанка, кампанія не шкадуе грошай, каб «мабілізаваць» нават самыя малыя вёсачкі:

— Усе заўвагі і скаргі грамадзян, дзе б яны ні пражывалі, улічваюцца. У нас ёсць тэхнічная магчымасць, а галоўнае — шчырае жаданне прыслухацца да прапаноў нашых абанентаў і павысіць камфорт карыстання нашай сувяззю ў канкрэтным раёне, вёсцы, дзе жывуць, працуюць і адпачываюць людзі...

Безумоўна, канкурэнты МТС таксама змагаюцца за кожнага патэнцыйнага кліента. Але ж, добра ведаючы зладжанасць работы супрацоўнікаў філіяла, іх мэтанакіраванасць, магу прагназаваць, што запланаванае абавязкова будзе выканана ў найбліжэйшай перспектыве.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

белагропромбанк
традиции будущего

ИЗМЕНЕНИЯ
в проспекты эмиссии облигаций
ОАО «Белагропромбанк»

Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 18.05.2009 зарегистрированы изменения в проспекты эмиссии облигаций ОАО «Белагропромбанк» для физических лиц на предъявителя двадцатого, двадцать первого, двадцать второго, двадцать третьего, двадцать седьмого, тридцатого, тридцать первого выпусков и для юридических лиц сорокового, сорок первого, сорок второго выпусков.

С изменениями в проспекты эмиссии вышеназванных выпусков облигаций можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата ОАО «Белагропромбанк» в течение их рабочего времени.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (Life:), Velcom, MTC) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

А не шкодзь!..

«Заплаціў» тэлевізарамі за дзіка

Тры тэлевізары былі канфіскаваныя ў браканьера ў якасці кампенсацыі нанесенага ім урону прыродным рэсурсам — незаконнай здабычы пятлёй дзіка. Суд Быхаўскага раёна прызначыў яму пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 2,1 мільёна рублёў з пакрыццём урону ў такім жа памеры, у лік якога і пайшлі тэлепрыёмнікі.

Больш за 5,2 мільёна рублёў штрафу прызначыў суд Шчучынскага раёна іншаму парушальніку за незаконную здабычу казулі. У яго канфіскавана паляўнічая стрэльба. Урон браканьер кампенсаваў добраахвотна да суда. Акрамя таго, на карысць мясцовага паляўнічага таварыства з грамадзяніна спагнаны 5-кратны кошт разавага дазволу на здабычу паляўнічай жывёлы для палявання ў памеры 350 тысяч.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАНЯДЗЕЛАК, 25 МАЯ

5.35 Серыял «Як сказаў Джым».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.55 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 «Зорныя танцы».
11.05, 17.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
12.10 Камедыя «Чатыры таксісты і сабака-2».
14.30 «Здароўе».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
19.35 «Арэна».
19.55 «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
22.55 Трылер «Дрэнная кампанія».
1.05 Дзень спорту.
1.15 Серыял «30 РОК».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 0.55 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40 Мультфільм.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 1.10 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
11.40 «Ералаш».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 «Рэкламная паўза».
16.15 Серыял «Прынцэса цырка».
17.05 «Раман Карцаў. Я ведаю, дзе зімуюць ракі».
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
19.05 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.05 Серыял «Паляванне на Берыю».
23.30 «Адваротны адлік». «Армія Краёва. Апошні бой».
0.00 Серыял «Місія празорлівасці».

6.55 «ЛАДная раніца».
7.55, 17.05 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Тэлебарометр.
8.35 Усё пра бяспеку.
9.05 У гэты дзень.
9.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.50 Меладрама «Добрая жанчына».
12.25 Гаспадар.
12.55 Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы-2».
13.45 Бухта капітанаў.
14.25 Мультфільм.
14.35 Мультсерыял «Русалачка». 1-я серыя.
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.10 Тайны смак.
15.40 Экспедыцыя.
16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Трэмінова ў нумар!». Заключная серыя.
19.55 Беларуская часінка.
20.55 Калыханка.
21.15 Экспедыцыя.
21.20 Дэтэктыў «Засада».
23.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд туру.

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.05 «Лёгкае жыццё».
7.30, 19.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.30 «Жывая гісторыя».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Кідалы».
12.05, 23.45 Маст. фільм «Чорны караван».
14.05 Мультфільм «Цуды краіны цацак».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 «Саюзнікі».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Паляўнічы».
20.00 «Слова за слова».
21.20, 3.00 Серыял «Вогнезмагары».
22.20 «Свет спорту».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25 «Метэапрагноз».
7.30 Трылер «Адзін прапушчаны званок».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Трылер «Палмета».
12.45 «Праз 30 гадоў».
13.00 Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
16.50 «Ін-фармацыя».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10, 23.20 Астра-, метэапрагноз.
21.15 Трылер «Пляцельшчык».
23.00 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 «Гукавая дарожка».
10.30 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 Дак. фільм «Святло зоркі. Іна Чурыкава».
12.20, 17.55 Серыял «Трымай мяне мацней».
13.15, 22.45 «Кулагін і партнёры».
13.50, 16.50, 18.50, 23.15 Навіны—Беларусь.
14.20 Маст. фільм «Ён, яна і дзеці».
15.35 Маст. фільм «Дні хірурга Мішкіна». 1-я серыя.
17.25 «Сумленны дэтэктыў».
19.30 Серыял «Кармеліта».
20.30 Серыял «Тэрмінова ў нумар-2».
21.30 Серыял «Трое супраць усіх-2».
22.30 «Нічога асабістага».
23.25 «Весткі+».
23.45 Дак. фільм «Па той бок цуда».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.35 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.05 «Асабліва небяспечны!».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Адвакат».
19.35 Серыял «Горад спакусы».
21.40 «Сумленны панядзелак».
22.40 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
23.25 Серыял «Мент у законе».
0.15 Серыял «Чужы твар».
1.05 «Школа зласлоўя». Ірына Волкава.

5.00, 15.10, 18.40, 3.35 Смак да жыцця.
5.40, 9.15, 16.00, 22.20, 4.15 Набалелае пытанне.
6.20, 17.05 Панацэя.
6.50, 17.40 Дзіця нарадзілася.
7.20, 18.10 Я.
7.45, 20.50 Нетрадыцыйная медыцына.
8.15, 21.20 Школа розуму.
8.45, 21.50 Як не згубіць здароўе?
9.55, 23.00 Колькі вам гадоў?
10.25, 23.30 Энцыклапедыя памылак.
10.40, 23.45 Выкрыццё прадуктаў.
11.10, 0.15 Хуткая дапамога.
11.45, 0.45 Увага, ежа!
12.10, 1.10 Здароўе з Малышавай.
12.45, 14.45, 20.25, 1.45, 3.10 Дзевяць месяцаў.
13.15, 2.10 Познай сябе.
13.45, 19.25, 2.40 Клінічны прагноз.
14.15, 19.55 Партрэт доктара.
16.40 Спытайце доктара.

6.00, 9.50, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Музыка на канале.
7.05, 14.00 Усё лепшае для Вас.
7.35, 10.00, 17.00 Прыгажуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 16.00, 4.00 Гісторыі поспеху.
11.00, 3.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 5.00 Твой дом.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Грошы на провадзе».

7.00, 9.00, 16.00 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.00 Паляўнічы на кракадзілаў.
10.00, 18.00, 23.00, 4.45 Фінікс: хуткая ветэрынарная дапамога.
11.00 Аддзел па абароне жывёл: паліцыя Маямі.
12.00, 19.00, 1.00, 6.35 «SOS дзікай прыроды».
12.30, 19.30, 1.30 Разбуральнікі стэрэатыпаў.
13.00 Свет прыроды.
14.00 Тэрыторыя жывёл.
15.00 Рууд і яго жукі.
17.00 Ветэрынары-стажоры.
17.30 «Запаведнік у нетрах Афрыкі».
20.00, 2.00 Памесце сурыкат.
20.30, 2.30 «Жыццё малпаў».
21.00, 2.55 Вяртанне дадому.
22.00, 3.50 «Галапагоскія астравы».
0.00, 5.40 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.

9.30, 21.30, 1.00 «Гейм, сэт і матс».
10.00 Мотаспорт.
10.15, 16.30, 1.30 Веласпорт. «Тур Італіі».
11.00, 18.45, 0.00 Тэніс. Турнір «Вялікага шлема».
18.30, 23.45 Футбол. Еўрагалы.
22.05 Пра рэстлінг.
23.30 Вось гэта дзіва!!!

21.20 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЗАСАДА» (ЗША, 1987 г.)

Паліцэйскія Крыс і Біл атрымліваюць адказнае заданне. Ім даручана весці назіранне за былой сяброўкай забойцы Мантгомеры, які ўцёк з турмы. Іх начальства ўпэўнена, што небяспечны злодзей абавязкова наведае даму свайго сэрца.

Рэжысёр — Джон Бэдэм. **У ролях:** Рычард Дрэйфус, Эмілія Эстэвес, Мэдлін Стоў, Форэст Уайтэкер, Эйдан Куін, Дэн Лорыя.

АЎТОРАК, 26 МАЯ

5.35 Серыял «Як сказаў Джым».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 1.00 Дзень спорту.
6.10, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.55 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 «Арэна».
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 «Жыццё як жыццё». «Мае браты і сёстры».
10.05, 16.55 Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
10.55, 17.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
11.40 «Зямля беларуская». «Шэпт Столінскай багны».
12.10, 21.50 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 «Ход у адказ».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Нябачны фронт».
16.05 Серыял «Дзве сястры».
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Серыял «Тэрарыстка Іванова». 1-я серыя.
21.00 Панарама.
22.55 Драма «Нябачны».
1.10 Серыял «30 РОК».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 0.50 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Чакай мяне».
10.00 «Дзмітрый Дзюжаў. На светлым баку жыцця».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30, 1.05 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 Серыял «Гарачы лёд».
16.15 Серыял «Прынцэса цырка».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Шалёны анёл».
22.10 Серыял «Паляванне на Берыю».
23.35 Наша Russia».
0.05 Серыял «Місія празорлівасці».

6.55 «ЛАДная раніца».
7.55, 16.55 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Серыял «Тэрмінова ў нумар!». Заключная серыя.
9.05 У гэты дзень.
9.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
11.45 Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы-2».
